# 50 БЕЛАРУСЬ, ЯК СВЯТА, АДЗНАЧАЕ ТВОЙ ЮБІЛЕЙ, НАШ РОДНЫ БДУ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29—30 (824—825) ● Субота, 30 кастрычніка 1971 г. ● Цана 4 кап. ● Год выдання XXIV



*Ніл ГІЛЕВІЧ*

## ДАРОГАЙ СЛАВЫ

*Яшчэ дыміліся руіны,*
*Яшчэ цямрэў разрухі цень,*
*Ды над прасторамі краіны*
*Ужо ўставаў высокі дзень.*

*Тады і быў уласнаручна*
*Падпісан ленінскі дэкрэт:*
*Адкрыць у Мінску Беларускі*
*Дзяржаўны ўніверсітэт.*

*І ў незабыўны дзень асенні,*
*Што зззяў, як раніца вясны,*
*У храме ў тым за парты селі*
*Працоўных дочкі і сыны.*

*Дзядоў, бацькоў надзея-мара*
*Для іх паўстала наяву...*
*Ад той пары прайшоў нямала*
*Дарогай славы БДУ.*

*Каб родны край падняць і ўзвысіць*
*Да зор камуны залатых —*
*Ён даў яму дзесяткі тысяч*
*Спецыялістаў маладых!*

*І лічыць кожны з іх за гонар,*
*Што быў студэнтам БДУ,*
*Што ў кузні сонечнай яго нам*
*Вучыўся праўдзе і дабру.*

*О, светлы час зіхцення вокан*
*У промнях раніяшняй красы —*
*Калі з юнацтвам яснавокім*
*Іравецца сонца ў карпусы!*

*О, родны сэрцу Беларускі*
*Дзяржаўны ўніверсітэт —*
*Ніхто душой не заскарузне,*
*Хто ў твой паверыў запавет!*

*Расці ж і слаўся год ад году,*
*Працоўны гонар беражы,*
*Служы Радзіме і народу,*
*Ідэям Леніна служы!*



## НАРОДЖАНЫ КАСТРЫЧНІКАМ

*А. Н. СЕЎЧАНКА,*
*рэктар БДУ, акадэмік АН БССР,*
*Герой Сацыялістычнай Працы*

Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна, 50-годдзе якога мы адзначаем, з'ўляецца першым цэнтрам культуры, навукі і асветы Беларусі. Прайшоўшы вялікі і слаўны шлях, наш універсітэт стаў цяпер адной з прызнаных устаноў вышэйшай адукацыі Савецкага Саюза. Па колькасці студэнтаў ён займае адно з вядучых месц сярод 50-ці універсітэтаў нашай краіны.

Беларускі універсітэт адыграў вялікую ролю не толькі ў падрыхтоўцы, фарміраванні і выхаванні савецкай інтэлігенцыі, але на базе яго факультэтаў былі арганізаваны такія буйныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, як політэхнічны, медыцынскі, педагагічны інстытуты, інстытут народнай гаспадаркі. Як старэйшая навукова-даследчая і навучальная ўстанова універсітэт унёс дастойны ўклад у арганізацыю і станаўленне інстытутаў Акадэміі навук БССР і ў стварэнне рэспубліканскай бібліятэкі імя У. І. Леніна. Вось чаму, адзначаючы вялікую ролю Беларускага універсітэта ў падрыхтоўцы кадраў і развіцці навукі, Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі і Савет Міністраў БССР 9 студзеня 1970 года прынялі пастанову, дзе ўказваецца: «Адзначыць 50-годдзе Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна як вялікую і знамянальную падзею ў жыцці беларускага народа».

За мінуўшыя паўвека адбыліся вялікія гістарычныя зрухі. Універсітэт даў краіне 30 тысяч спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі — матэматыкаў, фізікаў, хімікаў, біёлагаў, медыкаў, географаў, гісторыкаў, філолагаў, юрыстаў і г. д., якія плённа працуюць на розных участках камуністычнага будаўніцтва ў нашай рэспубліцы і ў іншых раёнах нашай краіны. Многія выхаванцы універсітэта сталі віднымі вучонымі, пісьменнікамі, выкладчыкамі, буйнымі партыйнымі, дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі.

У ліку выхаванцаў універсітэта лаўрэаты Ленінскіх прэмій академік АН СССР, акадэмік-сакратар аддзялення фізікі

(Заканчэнне на 2-й стар.)



## 50-летию БГУ

Ты первый из первых
В республике нашей,
Растешь, словно в сказке,
Становишься краше.
В стране заслужил ты
Достойную славу
И Ленина имя
Ты носишь по праву.
Души в тебе люд белорусский
Не чает
И храмом науки
Не зря величает.
...Тебе лишь полвека,
А сколько успел
Свершить для народа, —
Завидный удел!
Течет к тебе нынче
Приветствий река...
Будь славен, родной БГУ,
На века!

**В. СТАРОВОЙТОВ,**
воспитанник университета.





1921 БДУ 1971

# РАПАРТУЕМ ТАБЕ, БДУ

*Шмат вышэйшых навучальных устаноў Беларусі пачыналі сваё існаванне як факультэты БДУ. Аб сённяшнім дні Беларускага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага расказвае яго рэктар прафесар Ф. П. ШМЫГАЎ:*

— Сёлетні год юбілейны і для нас. Юбілейны двойчы. Па-першае, пяцідзесяцігоддзе універсітэта — гэта таксама наша свята, таму што наш інстытут гадаванец БДУ і бярэ свой пачатак з таго ж 1921 года. А па-другое, сёлетні год — саракавы год нашага самастойнага існавання.

Дзякуючы бацькоўскай падтрымцы і дапамозе БДУ Беларускі педагагічны стаў адным з буйных вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Аб гэтым яскрава сведчыць наступнае: дваццаць чатыры тысячы настаўнікаў, работнікаў дашкольных устаноў, бібліятэк атрымалі дыпломы аб вышэйшай адукацыі ў нашым інстытуце. Сярод выпускнікоў — 100 заслужаных настаўнікаў і звыш 150 выдатнікаў народнай асветы. Сёння на 6 факультэтах МДПІ імя А. М. Горкага займаецца 9 тысяч студэнтаў. Ім чытаюць лекцыі 480 выкладчыкаў, сярод якіх 18 прафесараў і дактароў навук, 200 кандыдатаў навук і дацэнтаў.

У інстытуце — 40 кафедр, шмат лабараторый і кабінетаў. Гэта дае магчымасць вучоным, аспірантам займацца навуковай работай, праводзіць фундаментальныя даследаванні. Многія работы нашых вучоных перакладзены на замежныя мовы. Цяпер, напрыклад, робіцца пераклад на японскую мову даследавання выкладчыкаў М. С. Цэрык і Г. П. Гаксева ў галіне фізікі.

Вялікая цікавасць да навукі і ў студэнтаў. Кожны трэці з іх — член студэнцкага навуковага таварыства. Многія нашы выхаванцы — лаўрэаты рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў студэнцкіх навуковых работ.

Сённяшні дзень нашага інстытута — гэта добрыя справы і пачынанні камсамоліі, гэта мільёны рублёў капіталаўкладанняў, асвоеных нашымі будаўнічымі атрадамі, гэта сотні лекцый і канцэртаў, з якімі выступаюць члены нашых агітбрыгад, гэта новыя спартыўныя перамогі. Ды хіба ж можна пералічыць усё тое, чым багаты сёння наш інстытут! І, безумоўна, сваімі поспехамі і перамогамі мы ў нейкай меры абавязаны свайму старэйшаму брату і вернаму сябру Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна.

Ад усяго сэрца дзякуем вам, дарагія калегі, шчыра віншуем са святам і жадаем не парушаць даўніх традыцый — заўсёды ісці ў авангардзе савецкай навукі!

# НЕ КАНЧАЕЦЦА НАША ЮНАЦТВА

МНЕ, КАМСАМОЛЬЦУ 20-х гадоў, асабліва дарагі юбілей Беларускага універсітэта, які носіць імя вялікага друга і настаўніка моладзі У. І. Леніна. Дарагі таму, што служыць яскравым прыкладам ажыццяўлення ленінскіх ідэй. Дарагі і таму, што ў сценах БДУ збылася мая юнацкая мара. Я паспяхова закончыў курс філфака. А пасля многа год з вялікім уздымам і натхненнем працаваў настаўнікам у сярэдняй школе.

Цяжка было адразу пасля фронту пераключыцца на вучобу. У многім дапамаглі чулыя і уважлівыя адносіны з боку выкладчыкаў. Заўсёды буду за гэта ўдзячны Васілю Іванавічу Сцяпанаву, Лаўрэнцію Сямёнавічу Абецэдарскаму, Мацвею Якаўлевічу Рэзнікаву і многім іншым.

Даводзілася працаваць па 16 гадзін у суткі, усё, што не адносілася да вучобы, адключыць ад свядомасці. І перамога прыйшла. Волю да яе ў нас, камсамольцаў 20-х гадоў, выхавалі Камуністычная партыя, Ленін, камсамол.

У жыцці нам даводзілася цяжка. Але мы не пасавалі. Мы ішлі ў бой за сённяшняе, а думалі аб будучым. Мы цвёрда ведалі і верылі,

...что наша юность<br>
тем хороша,<br>
Что<br>
от ленинского шалаша<br>
Ей открылись<br>
пути без предела.

І заўсёды, калі я бываю ў Мінску, спяшаюся зайсці ва універсітэт. Хочацца паглядзець на студэнцкую моладзь нашых дзён, палюбавацца ёю. Якая гэта вялікая чалавечая радасць — вучыць і самому вучыцца! І актыўна будаваць новае жыццё. Усім гэтым карыстаецца сучасная моладзь. Бачыш і адчуваеш: юнацтва камсамольцаў першых год рэвалюцыі працягваецца ў жыцці новых пакаленняў. І хочацца сказаць юным сябрам: свята захоўвайце традыцыі камсамольцаў старэйшых пакаленняў. Будзьце заўсёды, усюды і ва ўсім вернымі запаветам Уладзіміра Ільіча Леніна! Моцна і настойліва авалодвайце навукай!

З вялікім святам, дарагія выкладчыкі і прафесары! Вялікага шчасця, юныя сябры! Моцнага вам здароўя і новых творчых поспехаў.

**Я. БАЛАКІН,**<br>
**дэлегат III з'езда РКСМ,**<br>
**кавалер ордэна Айчыннай вайны I ступені,**<br>
**настаўнік-пенсіянер.**

# НАРОДЖАНЫ КАСТРЫЧНІКАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**і астраноміі АН СССР Л. А. Арцімовіч, народны паэт Беларусі акадэмік М. А. Барысевіч, акадэмік-сакратар аддзялення фізіка-матэматычных навук АН БССР Ф. І. Фёдараў, член-карэспандэнт АН БССР, прарэктар па навуковай працы універсітэта Л. В. Валадзько, акадэмік АН БССР, галоўны вучоны сакратар АН БССР А. С. Махнач, член-карэспандэнт АН СССР А. А. Шлык, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Ф. Л. Каханаў, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, загадчык аддзела навукі і вну ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч і яго намеснік Я. М. Бабосаў, пасол Савецкага Саюза ў Францыі П. А. Абрасімаў, пісьменнікі П. Трус, І. Мележ, Я. Скрыган, І. Шамякін і іншыя.**

**Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны разам з усёй краінай універсітэт ішоў па шляху новага росту і бурнага развіцця. У пасляваенны перыяд былі створаны новыя факультэты, кафедры, навуковыя кабінеты і лабараторыі, у значнай меры пашырылася вучэбная і навуковая работа, умацавалася матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта.**

**Толькі на працягу апошніх год ва універсітэце ўтворана 7 новых факультэтаў і больш 30 кафедр.**

**Сёння ва універсітэце налічваецца 15 факультэтаў. Непасрэднае кіраванне вучэбным працэсам выконваюць 90 кафедр, на якіх працуе 1770 выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, у тым ліку 17 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР і Акадэміі педагагічных навук СССР, 90 дактароў навук, прафесараў, 415 кандыдатаў навук, дацэнтаў, два Героі Сацыялістычнай Працы, тры Героі Савецкага Саюза, лаўрэаты Ленінскіх і Дзяржаўных прэмій.**

**Агульны лік студэнтаў дасягнуў 18 тысяч. Выпускнікі універсітэта паспяхова працуюць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры рэспублікі.**

**У нашым універсітэце атрымліваюць адукацыю студэнты розных нацыянальнасцей: беларусы, рускія, украінцы, яўрэі, палякі і студэнты з дружалюбных нам краін: Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, Балгарскай Народнай Рэспублікі, Афганістана, Рэспублікі Куба, Малі, Венесуэлы, Ірана, Самалі, Йемена, Камеруна, Танзаніі, Кеніі, Мангольскай Народнай Рэспублікі — усяго з 22 краін свету. Той факт, што ў нашым універсітэце вучацца студэнты з другіх краін, даволі красамоўны. 50 год таму назад у Беларусі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, і беларускія юнакі вымушаны былі пераадольваць вялікія цяжкасці і ехаць вучыцца ў іншыя краіны. Такіх шчаслíўцаў было вельмі мала. Сёння абставіны зусім іншыя. За паўвека адбыліся вялікія гістарычныя зрухі ў эканоміцы, палітыцы, тэхніцы, навуцы, адукацыі і культуры. Гэты небывалы ў гісторыі чалавецтва прагрэс і росквіт адбыўся дзякуючы мудрай ленінскай нацыянальнай палітыцы, якую праводзіць наша Камуністычная партыя.**

**Многае робіцца і для паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў студэнтаў, па арганізацыі іх адпачынку. У адным з маляўнічых куткоў — на возеры Нарач — штогод адпачываюць сотні студэнтаў.**

**Беларускі дзяржаўны універсітэт не толькі буйная навучальная установа, але і важны навуковы цэнтр, дзе вядзецца вялікая навукова-даследчая работа. Распрацоўваюцца пытанні гісторыі беларускага народа, яго літаратуры і мовы, праблемы ў галіне прыродазнаўчых навук: фізікі, матэматыкі, біялогіі, хіміі. Да арганізацыі Акадэміі навук БССР універсітэт з'яўляўся асноўным у рэспубліцы навуковым цэнтрам, дзе працавалі амаль усе вядомыя вучоныя рэспублікі. У галіне прыродазнаўчых навук асабліва цікавыя даследаванні праводзяцца на кафедрах ядзернай фізікі, паўправаднікоў, радыёфізікі і электронікі, спектраскапіі, цвёрдага цела, біяхіміі і многіх іншых. Асноўнымі цэнтрамі навукова-даследчай работы універсітэта з'яўляюцца навуковыя праблемныя лабараторыі і кафедры. У гэтым годзе пры універсітэце арганізаван інстытут прыкладных фізічных праблем. У бліжэйшыя гады будуць арганізаваны інстытуты прыкладной матэматыкі, хіміі, біялогіі і гуманітарных навук.**

**Мацнеюць міжнародныя сувязі універсітэта. Заключана пагадненне і падтрымліваюцца цесныя навуковыя і культурныя сувязі з зарубежнымі вну: з Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (ГДР), з Сафійскім універсітэтам імя К. Ахрыдскага (НРБ), з Люблянскім універсітэтам (СФРЮ) і радам вну Польскай Народнай Рэспублікі.**

**Беларускі універсітэт адным з першых прынят у члены Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў. Заслугі універсітэта атрымалі высокую ацэнку партыі і ўрада. Ён узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС, Памятным сцягам ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа, Ганаровымі граматамі Вярхоўных Саветаў Беларускай і Казахскай ССР.**

**У сваёй паўсядзённай працы універсітэт пастаянна атрымлівае дапамогу Цэнтральнага Камітэта і Савета Міністраў БССР. Вядома, без гэтай дапамогі немагчымы быў бы такі вялікі якасны і колькасны рост універсітэта, асабліва за апошняе дзесяцігоддзе. За гэта дзесяцігоддзе створана багатая матэрыяльная база, пабудаваны галоўны вучэбны корпус, фізічны і хімічны карпусы, 5 сучасных інтэрнатаў, і ў бліжэйшыя гады будуць пабудаваны жылы дом, вялікі інтэрнат для студэнтаў і маладых вучоных, будуюцца за межамі горада два буйныя карпусы для навукова-даследчых інстытутаў.**

**Натхнёны гістарычнымі рашэннямі XXIV з'езда КПСС, мнагатысячны калектыў універсітэта ўпэўнена нясе сцяг перадавой савецкай навукі, удасканальвае падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, выхаваных у духу вялікіх ідэй марксізму-ленінізму, здольных працаваць творча, самастойна рашаць актуальныя праблемы навуковага, тэхнічнага, культурнага і сацыяльнага прагрэсу нашай вялікай Радзімы.**

# 20-я гады

У першыя гады існавання БДУ ствараюцца ячэйкі камсамола на факультэтах. Спачатку самастойныя партыйная і камсамольская ячэйкі, згуртаваныя і дзеяздольныя, утварыліся на рабфаку. Камуністы і камсамольцы складалі большасць студэнтаў рабфака.

Да пачатку 1922-23 навучальнага года ва універсітэце ўтварыўся новы факультэт — педагагічны. Жыццё падказала неабходнасць аб'яднання камсамольцаў усіх факультэтаў у адну ячэйку КСМ Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ячэйка налічвала крыху больш за 60 чалавек. Камсамольцаў натхнялі і вучылі сваім асабістым прыкладам кіраўнікі партыйнай арганізацыі.

Студэнты-камуністы і камсамольцы працавалі на важнейшых участках. Яны выконвалі абавязкі сакратароў дэканата, прадметных камісій. Сталовай, інтэрнатамі, стыпендыямі займаліся выканаўчае бюро прафесіянальных секцый БДУ і прафкомы на факультэтах.

Амаль усю работу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці ў Мінску вяло студэнцтва на працягу 1921-27 гадоў. У ліку лепшых заўсёды былі камсамольцы.

Актыўную культурна-асветніцкую работу вяло наша студэнцтва і ў вёсцы. Там студэнты арганізоўвалі камсамольскія ячэйкі і ўсімі сіламі дапамагалі наладзіць работу.

Культурных сіл у камсамольскай арганізацыі раёна было недастаткова, але Кастрычніцкі райком ЛКСМБ заўсёды ведаў, што сярод камсамольцаў БДУ знойдуцца здольныя прапагандысты для гурткоў рабочай моладзі.

## Беларускаму Універсытэту.

Яшчэ ты малады. І толькі год адзін<br>
Ў тваіх сьцянах хвалюецца жыцьцё:<br>
Гартуе тут навукай пачуцьцё<br>
І гораду дзіця і вёскі беднай сын.<br>
Ты дзьверы адчыніў прасторныя для тых,<br>
Каму навукі шлях зачынен быў здаўна.<br>
Цяпер красуецца навукі збажына<br>
Для іх ў тваім сьвятое ад сьвятых.<br>
Няхай жа шырыцца навукі твой загон,<br>
Няхай нясе вялікі свой прыплод<br>
Ў наш цёмны край і сьветліць наш народ...<br>
Прайдуць гады. Магутныя дары<br>
Твае пажне, пажне з пашанай ён.<br>
Пад зыкі музыкі, пад гусьляў родных звон<br>
З дзьвярэй тваіх павыйдуць песьняры,<br>
Прарокі і тварцы навукі, пачуцьця,<br>
Як вышлі з сьцен краёў суседніх нам.<br>
Дык ты ж жыві, навукі вольны храм,<br>
Для лепшых дзён народнага жыцьця!

28—X—22 г. **А. Гурло.**

● СТАРОНКА ГІСТОРЫІ

# КАФЕДРА—ПРАДПРЫЕМСТВА

У сувязі з бурным ростам хімічнай прамысловасці і навукі падрыхтоўка хімікаў універсітэцкага профілю значна пашырана. Умацаваліся і сувязі факультэта з прадпрыемствамі. Нашы вучоныя аказваюць дапамогу ва ўдасканаленні тэхналагічных працэсаў, у распрацоўцы новых тэхналагічных схем. Усе кафедры факультэта выконваюць работы па гаспадарчых дагаворах з прадпрыемствамі. У гэтым годзе, напрыклад, такіх работ будзе выканана больш як на 400 тысяч рублёў.

На кафедры неарганічнай хіміі, якой загадвае выпускнік факультэта дацэнт В. В. Свірыдаў, больш дзесяці год вядуцца даследаванні ў галіне фатаграфічнага працэсу. Распрацаваны тут спосаб дазваляе атрымліваць фатаграфічныя адбіткі на слаях, якія ўтрымліваюць вельмі малую колькасць злучэнняў высакародных металаў, з выкарыстаннем бессярэбранага праяўлення. Спецыялісты фатаграфічнай справы далі высокую ацэнку гэтай навінцы. Спосаб будзе ўкаранён і забяспечыць вялікую эканомію серабра пры выкананні фатаграфічных работ. Зараз кафедра вядзе распрацоўку першых узораў новай фотапаперы.

Цесны кантакт устанавіла кафедра з заводам электронных вылічальных машын. Умацаванню гэтых сувязей садзейнічае тое, што яна сумесна з кафедрай фізічнай хіміі арганізавала падрыхтоўку спецыялістаў. Студэнты праходзяць на прадпрыемстве вытворчую практыку, а ў многіх выпадках выконваюць там і дыпломныя работы. Натуральна, што вяртаюцца сюды яны ўжо ў якасці дыпламаваных спецыялістаў.

Думаецца, што кафедра выбрала найбольш эфектыўны шлях праведзення прыкладных даследаванняў — сумесна з калектывамі заводскіх лабараторый. Такое кааперанванне кафедры з лабараторыямі і канструктарскімі бюро прадпрыемстваў дазваляе ў малыя тэрміны даводзіць навуковую распрацоўку да стадыі ўкаранення.

Паўнакроўныя сувязі ўсталяваліся паміж кафедрай аналітычнай хіміі (загадчык выпускнік БДУ, доктар хімічных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН БССР Р. Л. Старобінец) і Салігорскім калійным камбінатам. Па заказу камбіната кафедра распрацоўвае метад вызначэння ўтрымання астатковых амінаў і параметраў поліакрыламіду, даследуецца іх уплыў на эфектыўнасць тэхналагічнага працэсу.

Па заданню Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства распрацоўваюцца якасныя і колькасныя метады аналізу раданід-іёнаў у саломе, лубіне.

Акрамя таго, кафедра аказвае вялікую дапамогу прадпрыемствам па дагаворах садружнасці. У прыватнасці, на заводзе халадзільнікаў сіламі супрацоўнікаў і студэнтаў-практыкантаў вядуцца даследаванні па даставанню хрому са сцёкавых ваннаў храміравання з мэтай яго паўторнага выкарыстання.

Сумесна з Беларускім інстытутам навукова-тэхнічнай інфармацыі кафедра арганізавала пастаяннадзеючы семінар. Вучоныя кафедры кансультуюць работнікаў заводскіх лабараторый радыёзавода, завода медпрэпаратаў, завода эндакрынных прэпаратаў, аўтазавода, Гомельскага завода электраапаратуры.

У 1966 годзе на факультэце арганізавалася новая кафедра — хіміі нафты і хімічнай тэхналогіі. Калектыў яе адразу ж уключыўся ў даследаванні па заказах прадпрыемстваў. Выканана вялікая работа для Полацкага хімкамбіната па пераўтварэнню бутэн-бутыленавай фракцыі ў ізабутылен высокай чысціні. Вынікі яе адобраны Міністэрствам нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай прамысловасці. Прынята рашэнне аб укараненні.

У гэтым годзе завяршаецца выкананне заказу Магілёўскага хімкамбіната сінтэтычнага валакна па падбору змазачных матэрыялаў айчыннай вытворчасці для абсталявання камбіната. Работа ўкараняецца ў вытворчасць. Чакаемая эканомія складзе больш 100 тысяч рублёў у год. У даследаваннях удзельнічаюць студэнты старшых курсаў.

На кафедры арганічнай хіміі распрацаваны метады сінтэзу новых, раней недаступных злучэнняў, якія валодаюць антывіруснымі ўласцівасцямі. Для Наваполацкага хімкамбіната праводзяцца важныя даследаванні па адшуканні новых ініцыятараў працэсаў палімерызацыі.

Па выніках даследаванняў супрацоўнікаў кафедры фізічнай хіміі сканструяван газааналізатар кіслароду.

Важныя ў тэарэтычных і практычных адносінах работы праводзяцца і на кафедрах радыяцыйнай хіміі і хіміі палімераў.

Садружнасць навукі і вытворчасці становіцца ўсё больш плённай.

**Ф. КАПУЦКІ,**
**дэкан хімфака.**



*Вялікую і плённую работу па распаўсюджанні навуковых і палітычных ведаў сярод працоўных рэспублікі праводзіць арганізацыя таварыства «Веды» БДУ. Дзейнасць вялікага лектарскага калектыву неаднаразова адзначалася граматамі прадпрыемстваў, калгасаў і ўстаноў БССР. У грамадскім аглядзе па падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна універсітэцкая арганізацыя таварыства «Веды» заняла першае месца ў рэспубліцы і ўдастоілася дыплома I ступені.*

*НА ЗДЫМКУ: члены таварыства «Веды» —супрацоўнікі кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі на чале з прафесарам В. І. Сцяпанавым у час навукова-тэарэтычнай канферэнцыі ў г. Нясвіжы.*

Фота **Д. Чаховіча.**

# ФІЗІКІ... ЯК ФІЗІКІ

**У гэтыя святочныя дні прыемна і вельмі цікава пабываць на любым факультэце. У фізікаў, напрыклад, доўга не можаш адысці ад факультэцкай выстаўкі. Знаёмішся з гісторыяй і сённяшнім днём, здзіўляешся лічбам росту, захапляешся выхаванцамі, па-сапраўднаму таленавітымі, працавітымі, якія заканамерна заваявалі вядомасць.**

А якая ж цяперашняя моладзь? На стэндзе ёсць фатаграфія, зробленая ў студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі. Яна тут жа, непадалёку. Ля дзвярэй з цэлым шэрагам кнопак спыняюся, націскаю наўгад крайнюю — і адбываецца маленькі цуд — дзверы расчыняюцца. Пакой застаўлены прыборамі лабараторыі некалькі сталоў, стосы кніг. Пастаянна працуюць тут 20 чалавек. У кожнага з ветэранаў (ёсць і яны) сваё рабочае месца.

Мне расказвалі, што самыя актыўныя, зацятыя спрачальнікі і самааддана рабацягі — пяцікурснікі Міхаіл Аўсянікаў, Аляксандр Зайцаў, Валерый Кныш, Іван Савановіч, студэнты чацвёртага курса Уладзімір Васіленка, Аляксандр Белы, трэцякурснікі Валерый Піліпенка, Міхаіл Шышкоў.

Гэта яны ў мінулым навучальным годзе зрабілі доследны экземпляр генератара зандзіруючых сігналаў і здалі яго заказчыку. А ўсяго за мінулы год у студэнцкай лабараторыі выканана гаспадарчадагаворных работ на суму каля 70 тысяч рублёў. 11 дакладаў па выніках студэнцкіх даследаванняў былі прадстаўлены на юбілейнай канферэнцыі. Дзве работы пасланы на ўсесаюзны агляд.

Цяпер лабараторыяй кіруе малодшы навуковы супрацоўнік кафедры радыёфізікі і электронікі СВЧ Уладзімір Іванавіч Мікуловіч, які пачаў «кар'еру» фізіка ў гэтай жа лабараторыі. І тое, што ён стаў Ленінскім стыпендыятам, быў пакінут у аспірантуры і цяпер паспяхова займаецца навукай, — заслуга лабараторыі.

— Тут, — расказвае Уладзімір Іванавіч, — студэнты сутыкаюцца з самымі разнастайнымі тэарэтычнымі і практычнымі пытаннямі, знаёмяцца з усімі элементамі вылічальнай тэхнікі, вучацца працаваць з літаратурай, і часта з замежнай, значыць, набываюць навыкі перакладу. А пры непасрэдным канструяванні і вырабе прыбораў выконваюць усе інжынерныя і вытворчыя аперацыі.

**Праўда, былі і такія хлопцы, якія хацелі адразу «рабіць навуку». Але калі ўбачылі, што трэба раней папрацаваць напільнікам, навучыцца тое-сёе рабіць сваімі рукамі, іх цікавасць пагасла. Тыя ж, хто застаўся, станавіліся сапраўднымі даследчыкамі. І не дзіўна, што пад канец вучобы яны набывалі добрую інжынерную падрыхтоўку і на вытворчасці хутка ўваходзілі ў курс спраў.**

**Паказальны ў гэтых адносінах лёс першых супрацоўнікаў лабараторыі. Уладзімір Антонаў — цяпер вядучы канструктар на адным з мінскіх прадпрыемстваў. Леанід Буцько — галоўны спецыяліст завода, Анатоль Будай — старшы навуковы супрацоўнік на кафедры і г. д.**

Курыруе работу студэнцкага калектыву кафедра радыёфізікі і электронікі СВЧ, якая намала зрабіла ў фарміраванні навуковых інтарэсаў маладых даследчыкаў.

Цяпер у лабараторыі ёсць навічкі, якія толькі далучаюцца да справы і рыхтуюцца прыняць удзел у новай рабоце. А яна вельмі важная. Трэба будзе распрацаваць сістэму для аналізу шумаў рухавікоў. Заключан дагавор з прадпрыемствам. Маладыя фізікі выйшлі ў новы пошук.

**А. АЛЕНІЧ.**

# 40-я гады

У юбілейныя дні, якія перажывае цяпер універсітэт, мне ўспамінаецца 22 чэрвеня 1941 года. Універсітэт завяршыў падрыхтоўку да святкавання свайго 20-годдзя. На сценах калідора першага паверха геаграфічнага корпуса (тады галоўнага) ужо змантаваная юбілейная выстаўка. Вялікая група выкладчыкаў і студэнтаў, сабраная з ранку на вучэнне па грамадзянскай абароне, з моманту звесткі аб пачатку вайны, перайшла на казарменнае становішча ў памяшканні універсітэта. Кіруемая рэктарам Парфенам Пятровічам Савіцкім, гэта група арганізавала пастаянныя супрацьпажарныя пасты ў карпусах універсітэта, абсталявала пад бомбасховішча падвальныя памяшканні корпуса, дзе хаваліся жанчыны, дзеці і старыя з суседніх кварталаў. У адным з кабінетаў быў створан медыцынскі пункт. Там дзяўчаты-студэнткі аказвалі першую дапамогу ахвярам фашысцкіх бамбардзіровак. 24 чэрвеня, калі ў шматлікіх раёнах Мінска палыхалі пажары, выкліканыя бесперапыннымі налётамі фашысцкай авіяцыі, яшчэ ішлі пасяджэнні дзяржаўных экзаменацыйных камісій на гістарычным і геаграфічным факультэтах пад старшынствам акадэміка М. М. Нікольскага і прафесара М. М. Смірнова. Так калектыў універсітэта прыняў сваё першае баявое хрышчэнне.

**Л. М. ШНЕЕРСОН,**
**прафесар.**
(Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ ў 1938—1941 гг.).

● СТАРОНКА ГІСТОРЫІ

# ЁСЦЬ У КАГО ВУЧЫЦЦА

На адным з нядаўніх партыйных сходаў юрыдычнага факультэта дэкан Васіль Адамавіч Шкурко расказаў аб тым, што дасягнута, вызначыў перспектывы і задачы на цяперашні навучальны год. Паспяховасці студэнтаў была ўдзелена асаблівая ўвага. І гэта не выпадкова. Выдатныя веды студэнтаў — гэта залог паспяховай працы будучага спецыяліста. А юрыдычны факультэт у мінулым навучальным годзе па паспяховасці заняў вядучае месца ва універсітэце. У час летняй экзаменацыйнай сесіі студэнты, добра і выдатна здаўшыя экзамены, склалі 71 працэнт усіх навучэнцаў. 112 чалавек — выдатнікі вучобы. Сярод выдатнікаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці факультэта, ганаровае права на атрыманне імянных стыпендый заваявалі А. Баркоў (стыпендыя імя У. І. Леніна), Г. Шумак (стыпендыя імя К. Маркса), О. Курылёва (стыпендыя імя М. І. Калініна).

Поспехі радуюць, але і абавязваюць. Абавязваюць не спыняцца на дасягнутым, а ісці далей, пастаранца выкараніць пасрэдныя паказчыкі ў вучобе. Задача ўпаўне наспеўшая. Асноўныя ўмовы для яе рашэння на факультэце ёсць. У распараджэнні студэнтаў багатая спецбібліятэка з асобнай чытальнай залай, добра абсталяваныя лабараторыі і кабінеты.

На шасці кафедрах факультэта працуюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі. Цяпер на юрфаку 11 дактароў і 34 дацэнты і кандыдаты навук. Пяць год таму назад аб гэтым можна было толькі марыць. У апошняй пяцігодцы абаронена 9 доктарскіх і 11 кандыдацкіх дысертацый.

Імёны нашых прафесараў-юрыстаў Ф. І. Гаўзе, І. І. Гарэліка, А. В. Дулава, М. М. Авакава, С. Р. Драбязкі, І. І. Марціновіч, Г. Г. Цернавой, Н. Г. Юркевіча, В. Ф. Чыгіра, І. С. Цішкевіча, С. Р. Віхарава вядомы далёка за межамі нашай рэспублікі. Прафесар М. М. Авакаў і дацэнт В. А. Дарогін неаднаразова ўдзельнічалі ў міжнародных канферэнцыях і сімпозіумах. Праца прафесара А. В. Дулава «Судовая псіхалогія» прадстаўлена на ВДНГ СССР 1971 года.

Плённа працуюць дацэнты В. А. Шкурко, П. К. Еўдакімаў, К. А. Барзова, І. А. Юхо, П. А. Дубавец, А. А. Галаўко і многія іншыя. Іх кнігі сёння знойдзеш на паліцах кніжных магазінаў.

Студэнтам юрфака ёсць у каго вучыцца.

**М. ГАРБАР.**

# РАПАРТУЕМ ТАБЕ, БДУ

**А. А. КЛЮЧАРОЎ,**
**рэктар Мінскага медыцынскага інстытута:**

Вядома, што медыцынскі факультэт — адзін з першых факультэтаў універсітэта. У 1930 годзе ён паслужыў базай для стварэння медыцынскага інстытута. Да Вялікай Айчыннай вайны тут ужо было падрыхтавана 1380 урачоў.

У цяперашні час наш інстытут з'яўляецца адной з буйнейшых навучальных устаноў краіны, дзе рыхтуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты. Навучанне вядзецца на чатырох факультэтах: лячэбным, санітарна-гігіенічным, педыятрычным, стаматалагічным. На 51 кафедры працуе каля 420 выкладчыкаў, сярод іх 40 дактароў медыцынскіх навук і 240 кандыдатаў.

За час існавання інстытута падрыхтавана больш 15 тысяч урачоў. Сёння прафесію медыка набываюць 4000 студэнтаў.

Ёсць у нас і падрыхтоўчае аддзяленне, дзе 100 выпускнікоў розных школ паглыбляюць веды, выпрабоўваюць сваё захапленне медыцынай.

Многае робіцца для таго, каб стварыць студэнтам найлепшыя ўмовы для авалодання спецыяльнасцю.

У бягучай пяцігодцы па рашэнню ўрада рэспублікі будзе ўзведзен комплексны будынак інстытута.

На кафедрах вядзецца вялікая навуковая работа. Атрымалі жыццё новыя напрамкі медыцыны — медыцынская генетыка, кібернетычныя метады дыягностыкі і біякіравання, перасадка ныркі, вядуцца шырокія навуковыя даследаванні па вывучэнню сардэчна-сасудзістых захворванняў, міжорганных зрошчванняў і шмат іншых.

Сёння мы з гонарам адзначаем, што БДУ імя У. І. Леніна з'явіўся роданачальнікам многіх вну рэспублікі, дзе працягваюцца лепшыя яго традыцыі.

У дзень слаўнага юбілею мы ад усёй душы жадаем прафесарска-выкладчыцкаму саставу і шматлікай арміі студэнтаў моцнага здароўя, невычэрпнай творчай энергіі, поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, выхаванні іх у духу ідэй марксізму-ленінізму, Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

# ГАЛОЎНЫ КЛОПАТ

У перадюбілейныя дні на вучоным савеце па філалагічных навуках адбылася самая звычайная, радавая абарона кандыдацкай дысертацыі. Такая ж, якіх у нас бывае за год дзесятка паўтара. Але для нашай кафедры, узнікшай усяго пяць год таму назад, гэтая абарона вельмі знамянальная. Абараняў Браніслаў Плотнікаў, наш нядаўні студэнт, удзельнік нашага семінара, адным словам, наш выхаванец.

Калі аўтарытэтны маскоўскі апанент пахваліў дысертацыю Плотнікава і нават сказаў, што яна — першая ў Саюзе, зробленая па арыгінальнай і перспектыўнай методыцы, я ўспомніў, як Браніслаў некалькі разоў здзіўляў мяне. У першы раз — калі выбраў у якасці матэрыялу для сваёй семінарскай работы артыкулы Пісарава. Пазней, лепш пазнаўшы Плотнікава, я зразумеў, што ёсць у ім нешта пісараўскае, магчыма, спалучэнне працавітага рэалізму і лёгкага налёту рамантыкі. Калі праз месяц Плотнікаў прынёс цэлую гару матэрыялу, для збору якога іншаму студэнту спатрэбілася б гады два, я здзівіўся яго ўседлівасці. Пасля, на дзяржэкзамене па нямецкай мове, я даведаўся, што гэты выхаванец дзіцячага дома, паспеўшы адслужыць у арміі і папрацаваць будаўніком, цудоўна чытае па-нямецку і пераводзіць з ліста. Перад абаронай яго дыплома мы з Браніславам паляцелі на адну даволі прадстаўнічую і сур'ёзную навуковую канферэнцыю. Наш даклад паставілі на першым пленарным пасяджэнні, і чытаць яго давялося мне. А на адным з наступных пасяджэнняў я злёгку разгубіўся, убачыўшы, што Браніслаў просіць слова. Але ён зноў мяне здзівіў — змястоўнасцю і дзелавітасцю выступлення па адным з цэнтральных дакладаў канферэнцыі. Такіх радасных здзіўленняў было нямала. Аднойчы я сказаў Браніславу, што для яго работы вельмі важна было б вывучыць англійскую мову, а ў адказ даведаўся, што ён ужо з год займаецца самастойна і пачаў чытаць спецыяльную літаратуру. Дарэчы, адпраўляючы днямі на гадавую стажыроўку да матэматычных лінгвістаў Карлава універсітэта ў Празе, Браніслаў захапіў не толькі чэшскі слоўнік (перад ад'ездам ён вярнуў мне першую тоўстую спецыяльную кнігу, прачытаную ім па-чэшску), але і французскі: збіраецца прадоўжыць свае заняткі па французскай мове...

З Плотнікавым, канешне, нашай кафедры пашанцавала: і ў аспірантуры яго ўдалося пакінуць, і работу напісаў нядрэнную, і абараніў датэрмінова. Не ўсё атрымліваецца так гладка. Але як жа не радавацца атрыманаму нядаўна з Тартускага універсітэта зборніку студэнцкіх работ, у які ўключылі даклад Ларысы Мельнікавай. Тады, калі яна выступала ў Тарту, была яшчэ чацвёртакурсніцай. Цяпер ужо працуе, але па серадах па-ранейшаму прыходзіць на наш семінар. А ў маі гэтага года на ўсесаюзнай студэнцкай канферэнцыі па матлінгвістыцы ў МДУ наша семінарыстка Лена Шынкевіч здзівіла яе ўдзельнікаў мадыфікацыяй адной забытай методыкі, якая дазволіла своеасабліва атрымаць далёка не трывіяльныя даныя аб параўнальным багацці слоўніка адной аповесці Хемінгуэя і яе рускага перакладу.

Вясной, у заліковую пару, наша выкладчыца сербахарвацкай мовы Вера Міхайлаўна Лумбіна паказала мне кантрольныя сачыненні сваіх студэнтаў. У нас няма спецыяльнага славянскага аддзялення, і нашы беларусісты і русісты вывучаюць адну са славянскіх моў усяго год па разу ў тыдзень, а сачыненні, аказваецца, могуць напісаць даволі поўныя. І я ўжо не здзівіўся, калі перад нядаўнім першынствам Еўропы па спартыўнай гімнастыцы выхаванка нашай чэхісткі Наталлі Осіпаўны Зайцавай чацвёртакурсніца Наташа Івашына шукала чэшскі слоўнік па фізкультуры: ёй прадстаяла быць перакладчыцай. Чаму здзіўляцца — штогод цэлы атрад нашых балгарыстаў, паланістаў і іншых славістаў дапамагае «Спадарожніку» прымаць сяброў-турыстаў з сацыялістычных краін.

Падводзячы вынікі спаборніцтва да пяцідзесяцігоддзя, мы атрымалі спецыяльную брашурку з пералікам паказчыкаў работы, якія нам патрэбна мець на ўвазе. На адны пытанні мы адказвалі не без гонару: дзесятак кніг агульным тыражом каля трохсот тысяч экземпляраў і паўтары сотні іншых публікацый, дзве ўсесаюзныя канферэнцыі, якія нам даверылі арганізаваць, і 99 (самі здзіўляемся, чаму не 101) дакладаў на 38 навуковых канферэнцыях, якія зрабілі члены кафедры—гэта, канешне, нядрэнна. Але на некаторыя пытанні пераліку мы не адказвалі: сказаць было нечага. Нам пакуль не ўгнацца за пераможцай спаборніцтва на факультэце — кафедрай беларускай літаратуры, на якой за апошнія гады абаронена тры доктарскія дысертацыі. Не ўгнацца нам і за равеснікамі універсітэта —кафедрамі рускай і беларускай моў з іх вялікімі традыцыямі і значнымі справамі. Без дапамогі гэтых кафедр мы б не змаглі з'явіцца на свет як асобная кафедра і расці гэтыя пяць год.

Ёсць многа паказчыкаў у ацэнцы работы вузаўскага калектыву. І, канешне, далёка не па ўсіх мы можам вызначыцца так, як бы нам хацелася. Але хочацца думаць, што нешта важнае нам за пяць год удалося зрабіць.

У гэтыя дні універсітэт адзначае сваё пяцідзесяцігоддзе. Нашай кафедры ўдзесяцёра менш. Але ў нас на філфаку любяць паўтараць словы паэта: «Всё еще впереди». Галоўныя кнігі яшчэ не напісаны. Самыя бліскучыя лекцыі яшчэ будуць прачытаны. А самыя лепшыя студэнты, магчыма, яшчэ не паступілі да нас ва універсітэт. Аб іх, аб нашых былых, сённяшніх і будучых, абавязкова самых любімых вучнях, цяпер, у гэтыя юбілейныя дні, — галоўныя думкі. Для іх мы працуем, аб іх клапоцімся, імі ганарымся і іх поспехам радуемся. Для іх працуе кафедра. Для іх існуе універсітэт.

**А. СУПРУН,**
**прафесар, загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства.**

# НАЙМАЛОДШЫ

**Яму няма яшчэ і году. Гісторыя спецыяльнага факультэта прыкладной матэматыкі для працаўнікоў вытворчасці абмяжоўваецца ўсяго некалькімі месяцамі.**

**— Вытворчасці зараз вельмі патрэбны спецыялісты, якія маглі б выкарыстоўваць вылічальную тэхніку і матэматычныя веды, — расказвае выкладчык Г. І. ДРАБУШЭВІЧ, які займаўся наборам будучых студэнтаў новага факультэта.**

— Выпускнікі яго пойдуць працаваць у разнастайныя галіны вытворчасці, туды, дзе будуць створаны інфармацыйна-вылічальныя цэнтры.

**— Колькі студэнтаў займаецца на новым факультэце? Відаць, гэта людзі з працоўным стажам?**

— Так, нашы студэнты маюць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю і не менш як трохгадовы працоўны стаж. У А. В. Скатулавай, напрыклад, агульны стаж роўны адзінаццаці гадам. П. Ярошчык пасля заканчэння БПІ дзесяць год працаваў у праектным інстытуце. І такіх многа.

**— Некалькі слоў аб перспектывах.**

— Мяркуецца, што наш факультэт будзе расшырацца. У наступныя два гады прыём дасягне 150 чалавек. Будзе ўдасканальвацца сістэма навучання.

У факультэта вялікае будучае, бо спецыялісты, якіх рыхтуе факультэт, становяцца ўсё больш неабходнымі вытворчасці.

Усяго ж найлепшага самаму старэйшаму на факультэце... першаму курсу!

**Ф. САМУЙЛАВА.**

# У АДЗІНАЙ СЯМ'І



*(Нашы інтэрв'ю)*

Напярэдадні свята мы сустрэліся са студэнтамі з В'етнама і ГДР.

— На парозе паўвекавы юбілей універсітэта. Як рыхтуюцца да гэтай даты в'етнамскія студэнты-фізікі?

— Вельмі прыемна, што мы з'яўляемся студэнтамі БДУ ў той час, калі яму спаўняецца 50 год, — гаворыць Нгуен Куок Бао, намеснік прэзідэнта В'етнамскага зямляцтва.

— За два гады навучання універсітэт стаў для нас высокай школай жыцця, родным бацькам і маці. На беларускай зямлі мы адчуваем сябе па-дамашняму, нібы гэта наша спрадвечная Радзіма.

Цяпер, калі амерыканскія агрэсары імкнуцца задушыць свабоду нашай Айчыны, мы тут выконваем свой доўг, вучымся, каб стаць добрымі спецыялістамі і апраўдаць давер'е роднага ўрада, в'етнамскага народа.

Праз некалькі год мы закончым вучобу. Нам давядзецца будаваць новы В'етнам. Для гэтага патрэбна шмат ведаць і ўмець, каб усё тое, чаму мы навучымся ва універсітэце, аддаць на карысць Радзіме. Чым лепш мы будзем падрыхтаваны, тым больш зробім для свайго гераічнага народа.

Мне здаецца, што лепшы падарунак майму універсітэту — выдатная вучоба. У нас ёсць для гэтага ўсе магчымасці.

А да свята разам з савецкімі студэнтамі рыхтуем мастацкую самадзейнасць.

***

— Вашы ўражанні аб БДУ імя У. І. Леніна?

**Франк Буш** — студэнт I курса факультэта прыкладной матэматыкі, сакратар Саюза свабоднай нямецкай моладзі студэнцтва з ГДР:

— Да Беларускага універсітэта мы займаліся ў г. Галле, дзе рыхтуюць студэнтаў для вышэйшых навучальных устаноў Савецкага Саюза. Вучоба ва універсітэце імя У. І. Леніна — мара многіх юнакоў і дзяўчат ГДР. Быць студэнтам савецкай вну вельмі ганарова, і мы стараемся вучыцца як мага лепш.

Йоханес **Круша:**

— Для нас вельмі хвалююча прайшла сустрэча са сталіцай Беларусі, універсітэтам. Мінск — прыгожы горад. Мне ён вельмі падабаецца. За кароткі час мы пасябравалі з савецкімі студэнтамі. У пачатку кастрычніка адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 20-годдзю з дня навучання першых нямецкіх студэнтаў у СССР. Яго мы падрыхтавалі разам з савецкімі сябрамі. Нам было прыемна адчуваць сябе ў сяброўскім коле. У лістападзе споўніцца 22-годдзе з дня ўтварэння ГДР. Савецкія студэнты актыўна дапамагаюць нам рыхтавацца да гэтага свята.

За час вучобы мы пабывалі ў музеях Мінска, бессмяротнай крэпасці-герої Брэсце.

Яшчэ хочацца сказаць, што выкладчыкі універсітэта вельмі цікава і змястоўна чытаюць лекцыі. Мы вельмі ўдзячны універсітэту за гасціннасць і сардэчнасць.

Рыта **Шультцэ:**

— Нямецкія студэнты таксама рыхтуюцца да юбілею універсітэта. Разам з савецкімі таварышамі мы ўдзельнічаем у мастацкай самадзейнасці. Я буду выконваць рускую песню.

Вёў інтэрв'ю
**П. Дзетлікович.**



*На факультэце прыкладной матэматыкі займаецца вялікая група балгарскіх студэнтаў. Разам з савецкімі сябрамі яны наведваюць лекцыі, бібліятэкі, ходзяць у тэатры і кіно.*

**НА ЗДЫМКУ:** група савецкіх і балгарскіх студэнтаў з факультэта прыкладной матэматыкі ва універсітэцкім скверы.

Фота М. Нечыпарэнкі.

**Ф. В. БАРАВІК,**
**рэктар Інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава:**

— Дзень нараджэння першай вышэйшай навучальнай установы рэспублікі — Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з'явіўся пачаткам утварэння і нашага інстытута.

1 лістапада 1921 года на эканамічным аддзяленні факультэта грамадскіх навук пачалі заняткі 237 студэнтаў-эканамістаў. Потым падрыхтоўка эканамічных кадраў ажыццяўлялася на факультэтах эканомікі і права (з 1925 г.) і народнай гаспадаркі (з 1928 г.).

У 1931 годзе на базе факультэта народнай гаспадаркі БДУ былі ўтвораны тры эканамічныя інстытуты, злітыя пасля ў адзін Інстытут народнай гаспадаркі. Такім чынам эканамічнае аддзяленне БДУ было калыскай нашага інстытута. Але дзіця вырасла, і сёння на адзінаццаці факультэтах дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі вучыцца і павышае сваю кваліфікацыю больш 10 тысяч студэнтаў і слухачоў. У аспірантуры рыхтуюцца да навукова-педагагічнай дзейнасці больш двухсот аспірантаў. А ў народнай гаспадарцы працуе больш 18 тысяч эканамістаў і таваразнаўцаў— выпускнікоў інстытута.

Плён навуковых даследаванняў, якія праводзіліся, напрыклад, толькі ў восьмай пяцігодцы па 155 тэмах, складае некалькі мільёнаў рублёў.

Інстытут з'яўляецца ўдзельнікам ВДНГ 1971 года.

Мы заўсёды памятаем, што наш інстытут — дзецішча Белдзяржуніверсітэта, і заўсёды адчуваем бацькоўскія клопаты і дапамогу калектыву БДУ.

Сёння універсітэт адзначае сваё 50-годдзе. Нам асабліва радасна і прыемна вітаць маладых і сталых, віншаваць мнагатысячны калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў, аспірантаў, слухачоў і студэнтаў, пажадаць і ў будучым высока несці сцяг перадавой савецкай навукі!

Жадаем вам, дарагія сябры, здароўя, шчасця, ажыццяўлення асабістых планаў кожнага з вас!

# У НАВУКОВЫМ ПОШУКУ



*Калектыў кафедры біяхіміі ў сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 50-годдзя БДУ заняў першае месца на біяфаку. А загадчык гэтай кафдры А. Ц. Пікулеў сустрэў юбілейны год абаронай доктарскай дысертацыі.*

*НА ЗДЫМКУ: доктар біялагічных навук А. Ц. Пікулеў са сваімі аспірантамі.*

Фота *Д. Прэса.*

У Юрыя Канстанцінавіча Фамічова, дарэчы, як і ў кожнага дэкана, спраў было шмат. І ўсё ж ён ахвотна адказаў на ўсе пытанні. Размова зацягнулася, пэўна, таму, што расказваць аб біялагічным факультэце не вельмі проста, нават калі абмежавацца толькі навуковай работай, што тут вядзецца.

**— Раскажыце, калі ласка, аб найбольш важных праблемах, якія вырашаюцца на кафедрах факультэта. Як звязана навуковая праца з запатрабаваннямі народнай гаспадаркі?**

— На біяфаку 8 кафедр, лабараторыя фотасінтэзу, праблемная лабараторыя. Асновы навуковага жыцця факультэта, яго традыцыі закладзены вельмі даўно, і тут дарэчы зрабіць невялікі экскурс у гісторыю, успомніць нашых ветэранаў. Біялагічную навуку нельга уявіць без Рыгора Сямёнавіча Юньева. 20 гадоў ён узначальваў кафедру фізіялогіі чалавека і жывёл. Буйнейшы вучоны, адзін з нямногіх вучняў выдатнага савецкага фізіёлага А. Ф. Самойлава, Р. С. Юньеў адным з першых у Беларусі пачаў электрафізіялагічныя даследаванні. Пад яго кіраўніцтвам на кафедры была створана матэрыяльная база для навукова-даследчай работы ў гэтай вядучай галіне фізіялогіі. Рыгор Сямёнавіч цяпер на пенсіі, але на нашым факультэце працуюць яго вучні, дастойныя прадаўжальнікі яго справы.

Ціхан Мікалаевіч Годнеў з 1927 года ўзначальваў кафедру фізіялогіі раслін. Асноўны кірунак у біялагічнай навуцы, якому ён паклаў пачатак, інтэнсіўна развіваецца цяпер у АН БССР і на кафедры фізіялогіі раслін біяфака— фарміраванне фогасінтэзуючага апарата раслін у залежнасці ад умоў знешняга асяроддзя.

Ц. М. Годнеў — лаўрэат прэміі К. А. Ціміразева, якая прысуджаецца за выдатныя поспехі ў галіне фізіялагічных даследаванняў. Вывучэнне пігментаў у раслінах стала асноўным кірункам навукова-даследчых работ кафедры фізіялогіі раслін, якую ўжо на працягу многіх год узначальвае вучань і бліжэйшы супрацоўнік Ц. М. Годнева Уладзімір Сяргеевіч Калішэвіч.

У нашай краіне і за яе межамі вядома імя Георгія Георгіевіча Вінберга. Доўгі час — з 1946 па 1960 год — прафесар Вінберг загадваў кафедрай беспазванковых жывёл. Ён заснавальнік не толькі ў Беларусі, але і ў Савецкім Саюзе школы вывучэння прадуктыўнасці прэсных вадаёмаў. Вучоныя, якія прайшлі падрыхтоўку ў Г. Г. Вінберга, працуюць у навуковых установах Масквы, Ленінграда, Севастопаля, Уладзівастока. Многія навуковыя даследаванні яго вучняў, дасканалыя і глыбокія, увайшлі ў міжнародныя біялагічныя праграмы. Выхаванец і паслядоўнік прафесара Вінберга—дацэнт Павел Рыгоравіч Пятровіч. Апошнія 20 год ён быў дэканам біялагічнага факультэта і адначасова вёў вялікую навуковую работу на кафедры беспазванковых.

Многае зрабілі для развіцця навуковых даследаванняў на факультэце акадэмікі М. В. Турбін, П. Ф. Ракіцкі, М. А. Дарожкін, член-карэспандэнт АН БССР І. М. Сяржанін і многія іншыя, дзякуючы каму сённяшні біяфак — гэта буйная навукова-даследчая лабараторыя, вялікая школа падрыхтоўкі высокакваліфікаваных біёлагаў. Узяць для прыкладу хоць бы кафедру генетыкі (загадчык дацэнт А. В. Канстанцінаў). Тут распрацоўваецца пытанне эксперыментальнага ўздзеяння на працэсы дзялення клетак раслінных арганізмаў. Рашэнне гэтай праблемы дазволіць умешвацца ў спадчыннасць, уздзейнічаць на ўраджайнасць. Вывучэннем экалогіі жывёлы і пытаннямі, звязанымі з аховай прыроды, займаецца кафедра заалогіі пазванковых. Не менш важныя пытанні вырашаюць супрацоўнікі іншых кафедр.

**— Тэматыку якой групы Вы лічыце цяпер найбольш цікавай?**

У 1965 годзе ў нас была створана праблемная лабараторыя. Супрацоўнікі яе— выпускнікі універсітэта. Тут працуюць тры кандыдаты навук, 5 малодшых навуковых супрацоўнікаў. Найбольш цікавы—сектар гідрабіялогіі. Навуковыя даследаванні гэтага сектара вядуцца пры кансультацыях прафесара Г. Г. Вінберга. Разам з кафедрай беспазванковых гідрабіёлагі вывучаюць біялагічную прадукцыйнасць азёр (між іншым, працуюць яны ў разрэзе міжнароднай біялагічнай праграмы). Вырашэнне гэтай праблемы, калі гаварыць папулярна, дазволіць выявіць, колькі жывых арганізмаў можа пракарміць вадаём, колькі рыбы можна тут вылавіць, якая ступень забруджанасці вады і г. д.

Гэта, вядома, невялікая частка таго, на што скіраван навуковы пошук біёлагаў.

Інтэрв'ю правяла
**Г. Плігаўка.**

# ДУШОЮ МАЛАДЫ

Сёння ён пачне свой працоўны дзень як заўсёды. Толькі перш чым назваць тэму, скажа, мабыць: «Віншую вас, сябры, са святам!» Звонка, молада прагучыць голас прафесара, які і пасля 34 год працы ва універсітэце змог застацца маладым душою.

Так ужо прынята, што напярэдадні юбілеяў кожны падводзіць вынік пражытаму. Васілю Аляксеевічу Дзяменцьеву, загадчыку кафедры фізічнай геаграфіі СССР, ёсць аб чым успомніць.

Здаецца, зусім нядаўна ён, тады малады вучоны, прыйшоў працаваць на геаграфічны факультэт, а вось ужо два новыя пакаленні вучоных выраслі тут. Пра іх, сваіх сяброў і вучняў, Васіль Аляксеевіч гаворыць сёння з любоўю і цеплынёй.

У галіне ландшафталогіі працуе дацэнт Г. І. Марцынкевіч. Абараніла кандыдацкую дысертацыю аўтар кнігі па гісторыі фізіка-геаграфічных даследаванняў В. Г. Сінякова. Рыхтуецца да абароны кандыдацкай дысертацыі Н. К. Кліцунова. Займаецца пытаннямі мікраклімату Палесся аспірант Г. К. Каўрыга.

Васіль Аляксеевіч называе прозвішчы і імёны, кожнае з якіх — свая гісторыя, свой лёс, частка і яго лёсу.

Лёс жа ў яго зайздросны. Навуковае жыццё з самага пачатку было кіпучым. З дня стварэння кафедры фізічнай геаграфіі (у 1938 годзе) ён — загадчык. З 1943 па 1947 год — дэкан геаграфічнага факультэта. Потым доктарская дысертацыя і ўвесь час праца над артыкуламі, манаграфіямі, кнігамі.

Памятаюцца Васілю Аляксеевічу паездкі ў Польшчу па запрашэнню геаграфічнага таварыства ПНР і ў Карэю. Цэлы год ён выкладаў у Пхеньянскім універсітэце геаграфію, праводзіў семінары з выкладчыкамі па даследаванню тэрыторыі Карэі. Сёння здымкі, прывезеныя адтуль, занялі пачэснае месца ў святочнай выстаўцы кафедры.

І яшчэ шмат паездак, сустрэч, выступленні з дакладамі і лекцыямі.

Калі ў 1954 годзе было створана Геаграфічнае таварыства БССР, Васіль Аляксеевіч стаў яго першым старшынёй і з'яўляецца ім вось ужо 17 год. У камітэце па раяніраванню краіны, створаным у 60-я гады, ён быў упаўнаважаным па Беларускай ССР. Цяпер, калі схема фізіка-геаграфічнага раяніравання гатова, ён можа з гонарам паказваць яе гасцям.

Можна толькі здзіўляцца, як гэтага чалавека хапае ўсюды: ці гэта універсітэт навуковых ведаў для настаўнікаў, ці лекторый на камвольным камбінаце. А ён жа яшчэ шмат піша! Манаграфіі, даклады, падручнікі, выйшаўшыя толькі за апошнія тры гады, складаюць больш 100 друкаваных аркушаў. Работы кафедры фізічнай геаграфіі друкуюцца ў «Известиях АН СССР», «Вестнике МГУ» і іншых выданнях. Зараз Васіль Аляксеевіч Дзяменцьеў разам з групай выкладчыкаў працуе над другім выданнем «Геаграфіі БССР».

Васіль Аляксеевіч паказвае выстаўку, прысвечаную юбілею універсітэта. Добры, ласкавы позірк, сівыя валасы, бледны твар (нядаўна перанёс цяжкую хваробу). А як мяняецца ён у ходзе гутаркі! Адляцелі прэч гады!

— Практыку нашы студэнты праходзяць у розных кутках краіны. Займаюцца пытаннямі мікраклімату, ландшафталогіі. Працуем у садружнасці з метэаслужбай БССР, інстытутам «Мінскпраект» і інш.

А вось і вынікі: ландшафтная карта, шэраг карт у атласе БССР...

Я слухаю хлапечы голас сівога прафесара, і хочацца сказаць яму дзякуй. Не за расказ, хоць і за яго таксама, а за цудоўнае яго жыццё.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

# РАСКАЗВАЮЦЬ СТЫПЕНДЫЯТЫ:

**Анатоль Мяцельскі — студэнт V курса факультэта прыкладной матэматыкі, ленінскі стыпендыят.**

**— Анатоль, з першага курса вы займаецеся толькі на выдатна. Што дае вам магчымасць трымацца на такім узроўні, што стымулюе?**

— За ўсе гады вучобы я ўпершыню пачуў такое пытанне. Ніколі не задумваўся над гэтым. Але цвёрда ведаю, што ўвесь час у мяне было вялікае жаданне пазнаваць. Матэматыку, у прыватнасці, размаўляць з ёй на «ты». І яшчэ — што б я ні рабіў, заўсёды памятаю словы Валерыя Чкалава: «Калі быць, дык лепшым». Я іх разумею па-свойму: быць лепшым, хаця б у праяўленні сваіх здольнасцей.

— Што даюць вам веды?

— Многае і, перш за ўсё, уменне думаць, адрозніваць колеры жыцця, ці, проста кажучы,—адрозніваць добрае ад дрэннага. Я глыбока ўпэўнен: шлях да вяршынь маёй спецыяльнасці ляжыць праз веды ў самым шырокім сэнсе гэтага слова.

— Чым вы цікавіцеся, акрамя навукі?

— Інтарэсаў шмат, і самы вялікі— інтарэс да жыцця, да людзей. Крыўдна, што да гэтага часу існуе ўяўленне аб тым, што матэматыкі—«сухія» людзі. Мне незразумела, адкуль гэта пайшло: бо вялікія матэматыкі — гэта людзі самых разнастайных інтарэсаў. Музыка, паэзія ніколі не былі далёкімі для нас. Л. ПАРАХАЎНІК.

# ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

**25 кастрычніка ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ адбылося пленарнае пасяджэнне юбілейнай студэнцкай навуковай канферэнцыі. У форуме маладых даследчыкаў прынялі ўдзел студэнты ўсіх факультэтаў.**

* * *

**Напярэдадні юбілею ў студэнцкіх аўдыторыях адбылося многа сустрэч з першымі выпускнікамі БДУ.**

**Да студэнтаў філалагічнага факультэта прыйшлі пісьменнік Мікола Лобан і журналістка Вера Палтаран. Яны былі ў ліку выпускнікоў першых пасляваенных год і расказалі аб тым, як аднаўляў універсітэт работу на станцыі Сходня пад Масквой, як жылося тады студэнтам, расказалі аб сваёй творчасці.**

*(Заканчэнне на 6-й стар.).*

# 60-я гады

Па праўдзе кажучы, нам проста пашанцавала. Нам пашчаслівілася сустракаць 20-годдзе Вялікай Перамогі, 50-годдзе Вялікага Кастрычніка, паўвекавы юбілей ВЛКСМ, нашай рэспублікі і яе Камуністычнай партыі, 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна. І не толькі сустракаць, але і справамі ўдзельнічаць у дастойнай падрыхтоўцы да знамянальных дат. Гэтыя гады пранесліся, як віхор.

У 1967 годзе ў арганізацыі прайшла вялікая палітычная кампанія — абмен камсамольскіх дакументаў. У гэты ж год універсітэт быў узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а ў наступным — Памятным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

У гэтыя ж гады камсамольская арганізацыя універсітэта заняла першае месца ў краіне па пастаноўцы інтэрнацыянальнай работы, занесена ў «Летапіс працоўных спраў камсамола» за поспехі ў працоўных семестрах. Камсамольцы адкрылі «Летапіс камсамольскай славы», пачалі пошукі матэрыялаў аб загінуўшых у час вайны равесніках, працавалі на трактарным заводзе, каб папоўніць фонд будаўніцтва помніка студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам БДУ, аддаўшым жыццё за Радзіму, пабудавалі на грамадскіх асновах свой стадыён і да 100-гадовага юбілею У. І. Леніна сфарміравалі каля 100 лінейных будаўнічых атрадаў.

А ў некаторых справах нашым рабятам пашчаслівілася быць першымі. Першыя 13 энтузіястаў-добраахвотнікаў, студэнтаў-фізікаў, у 1965 годзе накіраваліся на лесасплаў на далёкія берагі Ангары.

Камсамольцы універсітэта прымалі першы ў рэспубліцы інтэрнацыянальны будаўнічы атрад чэшскіх, затым нямецкіх студэнтаў і выязджалі на будоўлі ў ЧССР і ГДР. Першымі ў рэспубліцы паклалі пачатак традыцыі штогадовага правядзення універсітэцкага злёту студэнтаў-будаўнікоў, «Тыдня памяці герояў».

Сустракаючы слаўны юбілей роднага універсітэта, камсамольцы 60-х гадоў па праву могуць сказаць, што добрасумленна працавалі, каб памножыць добрыя справы і павысіць аўтарытэт універсітэцкага калектыву.

**М. ЦІВА, сакратар камітэта камсамола БДУ 1966—1969 гг**

## ● СТАРОНКА ГІСТОРЫІ



Усюды жаданы госць народны ансамбль танца «Крыжачок».

# МАГУТНАЯ КАГОРТА

Гістарычны факультэт з поўным правам можна назваць кузняй высокакваліфікаваных настаўнікаў. Ужо напярэдадні вайны ў школы Беларусі прыйшло тры выпускі гісторыкаў. А чацвёрты — усяго сем студэнтаў — атрымаў дыпломы на Сходні. У першыя пасляваенныя гады асноўным кантынгентам студэнтаў былі дэмабілізаваныя воіны і былыя партызаны.

3186 чалавек — такі атрад спецыялістаў даў гістфак пасля вайны. Многім з іх прысуджаны званні заслужаных настаўнікаў БССР. Выдатнікамі народнай адукацыі сталі А. Я. Крышчановіч, дырэктар школы № 8 г. Мінска, Б. Я. Сіняўскі, намеснік дырэктара Нежкаўскай СШ, Е. Г. Бузава, намеснік дырэктара Лідскага індустрыяльнага тэхнікума і іншыя.

Значная частка выпускнікоў гістфака працягвае вучобу ў аспірантуры. У пасляваенны перыяд кандыдацкія дысертацыі абаранілі 87 чалавек, якія закончылі аддзяленне гісторыі, і 33 выпускнікі філасофскага аддзялення. 120 кандыдатаў навук! Гэта магутная кагорта ў радах вучоных Беларусі.

Пяць выпускнікоў гістфака — Л. С. Абецэдарскі, В. В. Чапко, П. Д. Пузікаў, А. С. Кляўчэня, Я. М. Бабосаў — ужо абаранілі доктарскія дысертацыі.

Кафедры гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, гісторыі філасофіі, логікі і псіхалогіі амаль поўнасцю складаюцца з малалых вучоных, закончыўшых гістфак.

Трэба сказаць, што асабліва вялікую ролю ў падрыхтоўцы выкладчыцкіх кадраў для вну Беларусі адыграла аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта. Вось адзін прыклад. У 1954 годзе аддзяленне закончылі 25 чалавек, 9 з іх у цяперашні час ужо абаранілі дысертацыі: А. А. Бірала, Р. М. Грынберг, М. І. Іоська, А. Я. Мурнеў, М. В. Окунь, А. А. Ракаў, А. С. Кляўчэня, У. А. Васільеў, В. А. Нядзелька, а астатнія выпускнікі гэтага курса вядуць выкладчыцкую работу ў вну і рыхтуюцца да абароны кандыдацкіх дысертацый. Староста гэтага курса А. С. Кляўчэня, цяпер доктар навук, будучы студэнтам, атрымаў Грамату Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР за дыпломную работу.

Сустракаючы 50-годдзе універсітэта, хочацца пажадаць былым і цяперашнім студэнтам вялікіх поспехаў у працы і навуцы.

**Ф. НЯЧАЙ, доктар гістарычных навук, прафесар.**

# ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.).*

**На ўсіх факультэтах і кафедрах у гонар юбілею аформлены стэнды, наладжаны выстаўкі, якія расказваюць аб справах студэнтаў, выкладчыкаў, аб тым, як ажыццяўляюцца гістарычныя рашэнні XXIV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**Восем кафедр філалагічнага факультэта падвялі вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя БДУ.**

* * *

**У сувязі з падрыхтоўкай да юбілею былі праведзены гутаркі аб універсітэце ў СШ рабочай моладзі № 14 горада Мінска, у калгасе «Непераможны сцяг» Дзяржынскага раёна. Цікавая сустрэча адбылася з замежнымі студэнтамі і вучнямі старэйшых класаў СШ № 79.**

* * *

**На факультэце журналістыкі аформлен стэнд «Роднаму універсітэту прысвячаем», дзе прадстаўлены фотаздымкі, жывапіс і графіка студэнтаў В. Жука, В. Дранчука, Н. Лось і іншых.**

* * *

**«Пісьменнікі Беларусі — выхаванцы БДУ»—так названа кніжная выстаўка, якая адкрыта ў бібліятэцы галоўнага корпуса. Тут экспануюцца кнігі беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, якія вучыліся ва універсітэце. Сярод іх зборнікі вершаў Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Анатоля Вярцінскага, кнігі Петруся Броўкі, Барыса Сачанкі, Алеся Пальчэўскага і інш.**

* * *

**Многа экскурсантаў прыходзіць у заалагічны музей БДУ. Тут пабывалі студэнты з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Польшчы, Венгрыі. На днях музей наведала вялікая група замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта.**

**В. ПАЛІШЭВІЧ, Ф. САГАНОВІЧ.**

# НА РАДАСЦЬ ЛЮДЗЯМ

18 кастрычніка 1971 года. Камітэт камсамола факультэта прыкладной матэматыкі... Сімвалічны рапарт: «Дадзена 4 канцэрты, прачытана 4 лекцыі, ускладзены кветкі...» Так закончыўся двухдзённы рэйд агітбрыгады ФПМ па Валожынскаму раёну.

Як гэта было? Пачаць, напэўна, трэба... з мінулага года. У лістападзе адбыўся першы канцэрт нашай агітбрыгады, маладой тады яшчэ і нявопытнай. Пасля гэтага шмат «вады ўцякло», дакладней, адбылося канцэртаў, выступленняў у розных раёнах вобласці, на вечарах факультэта. Помніцца першы рэйд агітбрыгады. Зноў-такі ў Валожынскі раён. Ён быў прыўрочан да XXIV з'езда КПСС. Было тады нас 11 чалавек. Зразумела, цяжка ў такім саставе даваць на паўтары гадзіны канцэрт, але ніхто не скардзіўся, хоць і прыходзілася часам ездзіць на грузавых машынах (а стаяў люты). Але якое задавальненне мы атрымлівалі, калі нашы нумары вызывалі смех, буру апладысментаў, калі лектару задаваліся пытанні.

Выступалі ў школах, калгасах, саўгасах. Было прыемна пачуць, што аб нашым універсітэце шмат ведаюць, зацікаўлены жыццём студэнтаў, Мінскам, яго тэатрамі, музеямі. Прымалі нас добра, нават больш таго — здорава! Таму калі зайшла размова аб новым рэйдзе, агітбрыгадаўцы вырашылі: «Толькі ў Валожын»!

Такім чынам, мы зноў у Валожынскім раёне, на гэты раз напярэдадні 50-годдзя БДУ. Валожынскі райком партыі прадастаўляе нам аўтобус. Нас — 26. Першы пункт выступлення— вёска Вішнева (калгас імя Горкага).

Пры ўездзе ў вёску стаіць велічны абеліск. Мінутай маўчання ушанавалі памяць загінуўшых. Усклалі кветкі. Суровую праўду тых год расказаў нам настаўнік І. А. Абрамовіч.

Затым вясковы клуб. лекцыя аб 50-годдзі універсітэта, а потым канцэрт. Доўга не адпускаюць гледачы жанглёра П. Матуса. «частушачнікаў» Л. Мокіну, Г. Марскую, А. Кісялёва.

У час канцэрта, як і на працягу рэйда, нашы «спецыяльныя карэспандэнты» працуюць: інтэрв'ю, сустрэчы, гутаркі... Бо пасля вяртання выйдзе спецыяльны выпуск газеты. Гэта ўжо традыцыя.

Хутка пралятаюць паўтары гадзіны. Кароткі адпачынак — і ў дарогу. Наступны прыпынак у саўгасе «Багданаўскі». Ля клуба красуецца аршынная аб'ява аб урачыстым вечары, прысвечаным 50-годдзю БДУ. Сустракае нас сакратар парткома...

Здаецца, мы не ашукалі надзей сельскіх працаўнікоў. Пасля вячэры нас размяшчаюць на начлег. Але хіба заснеш? Ідзём у клуб на танцы, абмяркоўваем прайшоўшы дзень, намячаем планы на заўтра.

Апошні пункт паездкі — калгас імя Чапаева. Вялікі сельскі Палац культуры. Зала поўная (350 чалавек). Лекцыя і канцэрт.

Прызнацца, вельмі стаміліся за гэтыя два дні, але агітбрыгаднік павінен заставацца агітбрыгаднікам. Гучыць апошняе «Бывайце здаровы»... Нас не хочуць адпускаць, просяць застацца на танцы, але трэба ехаць— да Мінска больш 100 кіламетраў, а заўтра лекцыі.

У заключэнне крыху статыстыкі. Агітбрыгада існуе няпоўны год. яшчэ маладая, як малады і наш факультэт, але два рэйды, разавыя выезды дазволілі даць ужо 13 канцэртаў, наезджана 1370 км. Нас слухала каля 2000 чалавек. А гэта здорава! Адчуваем — мы вельмі патрэбны людзям.

**А. НОВІКАЎ, студэнт III курса ФПМ.**

# ІМІ ГАНАРЫЦЦА МАТЭМАТЫЧНЫ

З адкрыццём матэматычнага факультэта пачалася падрыхтоўка навуковых кадраў праз аспірантуру, а таксама падрыхтоўка матэматыкаў па спецыялізацыі «вылічальная матэматыка». Новую кафедру і ўсю работу па вылічальнай матэматыцы ў рэспубліцы ўзначаліў акадэмік АН БССР А. І. Крылоў, зараз заслужаны дзеяч навукі БССР. З прыходам у БДУ акадэміка АН БССР М. П. Яругіна, зараз заслужанага дзеяча навукі БССР, Героя Сацыялістычнай Працы, ва універсітэце пачалі развівацца навуковыя даследаванні па звычайных дыферэнцыяльных ураўненнях і здзяйсняцца падрыхтоўка навуковых кадраў.

У 60-я гады адна за другой адкрываецца рад кафедр, на чале якіх становяцца вядомыя вучоныя, здольныя павесці за сабой навуковую моладзь, такія, як акадэмік Ф. Д. Гахаў, член-карэспандэнт АН БССР Д. А. Супруненка, акадэмік Е. А. Барбашын, прафесары А. Е. Турэцкі, В. І. Вядзернікаў, І. А. Трусаў.

За перыяд сваёй дзейнасці Белдзяржуніверсітэт падрыхтаваў 3255 спецыялістаў-матэматыкаў, якія паспяхова працуюць у вышэйшых навучальных установах, навукова-даследчых інстытутах, у вылічальных цэнтрах, канструктарскіх бюро, тэхнікумах і сярэдніх школах нашай рэспублікі і за яе межамі. Толькі сярод супрацоўнікаў Інстытута матэматыкі АН БССР — 152 выпускнікі БДУ, у тым ліку 2 дактары навук, 18 кандыдатаў навук. Нашых выпускнікоў можна сустрэць і ў інстытутах тэхнічнай кібернетыкі, ядзернай энергетыкі, цепла- і масаабмену, на заводах.

Сярод выхаванцаў факультэта 6 дактароў фізіка-матэматычных навук. Гэта Б. П. Дземідовіч, прафесар Маскоўскага універсітэта, заслужаны дзеяч навукі РСФСР, Я. А. Іваноў, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі, У. П. Платонаў, член-карэспандэнт АН БССР, А. Х. Турэцкі, загадчык кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу.

Выхаванцам факультэта з'яўляецца доктар тэхнічных навук І. А. Прусаў, загадчык кафедры тэарэтычнай механікі. У верасні 1971 года доктарскую дысертацыю абараніў выпускнік факультэта дацэнт Н. А. Лукашэвіч.

Выпускнікі факультэта У. П. Платонаў і Н. В. Шкут —лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола.

Сярод выпускнікоў-матэматыкаў звыш 100 чалавек абаранілі дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук. 29 з іх працуюць зараз у нашым універсітэце. Дыплом выдатніка атрымалі каля 200 выпускнікоў факультэта.

Каля 750 нашых выхаванцаў выкладаюць матэматыку ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах нашай рэспублікі і за яе межамі. Высокага звання заслужанага настаўніка ўдастоены Н. Я. Лазук, А. І. Ляхаў, В. І. Канецкі, П. Ф. Шкаленка, А. К. Суроўцава. Узнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы» І. Ф. Бертнік і І. С. Плавінскі, І. П. Кніга і Н. А. Цілюпа, Л. В. Колкава і іншыя.

Побач з вопытнымі педагогамі паспяхова працуюць маладыя настаўнікі, якія за два-тры гады змаглі праявіць не толькі добрасумленнасць, але і творчы падыход да выкладання матэматыкі і выхавання школьнікаў. Гэтыя рысы характэрны для такіх нашых выпускнікоў, як А. К. Праневіч і Л. М. Безмен, В. С. Гушча, Н. Н. Бокуць, і многіх іншых, якія працуюць у раёнах, а таксама для маладых настаўнікаў мінскіх школ, такіх, як В. М. Сопелеў, М. А. Лукша, Г. В. Шкроб, Л. А. Едэшка і іншыя.

Цяпер матэматычны факультэт — адзін з буйнейшых факультэтаў універсітэта. Тут навучаецца 1327 студэнтаў. Факультэт аказвае дапамогу другім краінам у падрыхтоўцы нацыянальных кадраў. Разам з савецкімі юнакамі і дзяўчатамі матэматычную падрыхтоўку атрымліваюць 87 студэнтаў з Афганістана, Балгарыі, Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, Йемена, Лівана, Танзаніі і іншых краін.

Калектыў матэматычнага факультэта з вялікім пад'ёмам, энтузіязмам і энергіяй працаваў у юбілейным годзе, рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя свайго універсітэта. У выніку паспяхова выкананы сацыялістычныя абавязацельствы і дасягнуты новыя поспехі ў вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай рабоце.

**А. ГУСАК, дэкан матэматычнага факультэта.**

*У час экскурсіі па гарадах Беларусі.*
*Фота Д. ПРЭСА.*





ФІЛОСАФЫ З ПРАЦОЎНЫМІ РУКАМІ

Хлопцы з СБА «Фартуна» гістарычнага факультэта. Фота В. ЖУКА.

# ДАЛЁКІЯ СТЭПЫ ЎРЫВАЮЦЦА Ў СНЫ

Вось і складзены ў чамаданы форменкі байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Але не-не, ды і ўрываюцца ў сны бяскрайнія жоўтыя стэпы, стрэлы далёкіх дарог. Дзевятае лета прадстаўнікі вну беларускай сталіцы і іншых гарадоў рэспублікі праводзілі на будаўнічых пляцоўках Уральскай вобласці. Наш універсітэт адкамандзіраваў на цаліну сёлетняга працоўнага семестра каля 400 чалавек. Месца дыслакацыі атрадаў БДУ традыцыйнае — Чапаеўскі раён. Мы ганарымся, што фронт нашага працоўнага семестра пралягаў там, дзе калісьці быў фронт грамадзянскай вайны—пярэдні край барацьбы за Савецкую ўладу. Дэвіз сённяшніх байцоў: «50-годдзю БДУ—нашы справы і ўдарная праца!».

Мабыць, у гэтыя дні ў пабудаваных студэнтамі дамах гучаць заздраўныя тосты, пажаданні хлеба-солі навасёлам. І як тут не ўспомніць загарэлых, з вясёлай іскрынкай у вачах хлопцаў і дзяўчат! Гэта ж яны прывезлі радасць працаўнікам Прыўралля. Дзесьці займаюцца ў адрамантаваных і пабудаваных байцамі школах вучні саўгасаў імя Куйбышава, «Першамайскі», «Алгабаскі». А «віноўнікамі» ўрачыстасці сталі атрады «Феміда-2» і «Феміда-1» юрфака, «Вікторыя» гістфака. Нямала цёплых слоў выказалі студэнтам земляробы саўгасаў імя Батурына, «Краснагорскі». Тут дзейнічалі СБА «Градзіент» і «Эфебія» з матфака.

Усяго універсітэцкімі атрадамі ва Уральскай вобласці асвоена каля паўтара мільёна капіталаўкладанняў. Узведзены дзесяткі школ, вытворчых памяшканняў. Лепшым прызнан СБА «Феміда-2». Заслуга ў гэтым, у першую чаргу, камандзіра Леаніда Петуховіча, камісара Валерыя Свірыдава, байцоў Барыса Банькоўскага, Міхаіла Арэшкі, Вольгі Курылёвай.

Паважалі нашых рабят не толькі за працу, але і за вясёлыя канцэрты, цікавыя лекцыі і даклады, спартыўныя сустрэчы.

«Цаліна-71» закончылася. Наперадзе новы працоўны семестр. І ў штабах студэнцкіх будаўнічых атрадаў размова аб будучым леце. Цаліна на канчаецца.

М. ШЛОМА,
камісар Чапаеўскага міжраённага штаба СБА.

# Слова—наймаладшым

## ВЯДЗЕ МАРА

НЕ АДРАЗУ пераступіў я парог вышэйшай навучальнай установы, як калісьці хацелася. Уступныя экзамены ў той год, пасля заканчэння сярэдняй школы, не прынеслі жаданага поспеху. Тыя выдатныя і добрыя адзнакі ў атэстаце сталасці былі, відаць, далёка яшчэ не выдатнымі. Прыйшлося адступіць, набрацца сіл, капітальна падрыхтавацца.

Не раз свідравала думка: а ці правільны шлях выбіраю? І хоць рамантыкі паменшылася, мара стаць журналістам усё больш сталела. Шмат сапсаваў паперы, пакуль у мясцовай «раёнцы» не з'явілася некалькі радкоў з першай маёй «інфармушкі». Якое было захапленне! Хадзіў не па зямлі, а па небе. Уявіце сабе—«пісьменнік»!

Смела аднойчы звярнуўся да рэдактара.

— Прыміце мяне на работу.

— А што ты ўмееш рабіць?

— Пісаў у газету заметкі, дасылаў вершы...

Узняў ён тады галаву ад стала, паглядзеў на мяне з нейкім жалем:

— Гэтага, старык, мала. Але так і быць, прыму цябе да друкара вучнем?!

Дзякую цяпер я свайму лёсу за першыя жыццёвыя выпрабаванні. Многаму навучыла рабочая роба. Адчуў адказнасць за тыя словы, якія з-пад пяра ператвараюцца ў металічныя радкі. Не дзіўна мне цяпер тое, што не толькі пісьменнікаў і публіцыстаў рыхтуе факультэт журналістыкі, а і самых, што ні на ёсць, рабацяг для самай чарнавой газетнай работы.

Цікава склаўся жыццёвы шлях у Віктара Супрунчука. Пасля школы ён закончыў электратэхнічнае вучылішча ў родным горадзе Белазёрску. Працаваў электрагазазваршчыкам, вісеў, апаясаны ланцугамі, на слупах. Многа ездзіў, таму многа бачыў. Аб сваіх уражаннях пастараўся напісаць у газету. Надрукавалі.

Пажыць у больш шырокім коле людзей, працуючы ў дружным заводскім калектыве. Праз некаторы час здзяйсняе сваю мару.

Жыццё завода апісвае ў сваіх заметках, нарысах, якія вельмі ахвотна друкуюць у заводскай шматтыражцы. Адначасова вучыцца ў грамадскім універсітэце журналістыкі пры абласным выдавецтве. Цікавыя матэрыялы Валянціны ўсё часцей з'яўляюцца ў газеце «Брянский рабочий». А потым рэдакцыя рэкамендуе яе да паступлення ў БДУ на факультэт журналістыкі. Выдатна вытрымаўшы экзамены, яна—студэнтка.

З таго часу і авалодала хлопцам мара паступіць на факультэт журналістыкі. Нямала прайшло яшчэ часу, каб ажыццявіць задуманае. Але гады не перашкаджалі, а ўмацоўвалі ўпэўненасць у сваю сілу. Многа дала служба ў Савецкай Арміі. Пасябраваў ён тут з салдацкай «дывізіёнкай». Вярнуўся з арміі камуністам. Даўняя неспакойная мара прывяла яго ў БДУ.

— Чым кіравалася, паступаючы на факультэт журналістыкі?—пытаюся ў аднакурсніцы Валянціны Сандыравай.

— Імкненнем навучыцца пісаць пасапраўднаму, пазнаць дух і сілу газетнага радка,—чую ў адказ.

Закончыўшы школу у 1969 годзе ў г. Бранску, пайшла працаваць Валянціна ў бібліятэку. Спакойная работа бібліятэкара не задаволіла дзяўчыну. Была мара

Вось так і склаўся наш калектыў. Жыццёвая сцяжынка кожнага яшчэ толькі пачалася, каб вывесці ўсіх на шырокую самастойную дарогу. Але мы крочым, падтрымліваючы адзін другога, пераадольваючы першыя студэнцкія няўдачы і цяжкасці, і радуемся за першыя поспехі ў вучобе і грамадскім жыцці факультэта. Уперад вядзе нас адзіная мара—быць сапраўдным журналістам, разведвальнікам жыцця.

В. ХАРЫТОНАЎ,
студэнт І курса журфака.

# 70-я гады

Яны ўнеслі ў жыццё новую форму работы — Усесаюзныя Ленінскія залікі, якія ўзнялі ініцыятыву кожнага камсамольца, яго імкненне вымяраць свае ўчынкі па ленінскіх нормах.

Успомніце, якімі падзеямі азнаменаваліся гэтыя гады: стагоддзе з дня нараджэння У. І. Леніна, XXIV з'езд ЛКСМБ, XXVII з'езд КПБ, XVI з'езд ВЛКСМ, 50-годдзе ЛКСМБ, XXIV з'езд КПСС!

Гэты навучальны год пачаўся з першага Усесаюзнага злёту студэнтаў, які ярка акрэсліў задачы студэнцкай камсамоліі на бліжэйшыя гады. Галоўнай задачай камсамольскай арганізацыі універсітэта была і застаецца барацьба за веды, за ператварэнне вучобы кожнага студэнта ў яго грамадскі абавязак перад Радзімай. І не выпадкова за гэтыя гады паспяховасць ва універсітэце павысілася на 2,3 працэнта. Каля 1300 студэнтаў вучацца толькі на выдатна — гэта кожны сёмы. У БДУ 17 імянных стыпендыятаў.

Менавіта ў гэтыя гады камсамол вну энергічна прыцягвае студэнтаў да навуковых даследаванняў, да выканання гаспадарча-дагаворных работ, якія маюць непасрэдную сувязь з народнай гаспадаркай. Універсітэт заняў першае месца ў БССР па пастаноўцы навукова-даследчай работы студэнтаў і заваяваў кубак «Навука». Кожны трэці студэнт зараз працуе у НСТ, але ўсё ж-такі нельга забывацца пра тых, хто вучыцца толькі па праграме-мінімум. У іх душы яшчэ не пранік хвалюючы агонь навуковай творчасці. Запаліць яго — вось задача камсамольскай арганізацыі.

У апошні час работа нашай арганізацыі была высока адзначана — мы ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Студэнты-актывісты атрымалі ўрадавыя ўзнагароды. Чацвёра нашых таварышаў былі дэлегатамі Усесаюзнага злёту студэнтаў. За вялікія заслугі перад універсітэтам сотні нашых камсамольцаў узнагароджаны юбілейнай Ганаровай граматай. Усё гэта азначае не толькі прызнанне заслуг, але і выражае надзею старэйшага пакалення на тое, што студэнты-камсамольцы выканаюць вялікія задачы, пастаўленыя перад моладдзю XXIV з'ездам КПСС.

Камсамольская арганізацыя зараз рыхтуецца да свайго юбілею. У снежні 1971 года нам спаўняецца 50. Нашы рады памножыліся ў 240 разоў—ад сарака да 9600! Шмат зроблена, але наперадзе яшчэ больш грандыёзныя задачы.

В. ПРАКОШЫН,
сакратар камітэта камсамола БДУ.

● СТАРОНКА ГІСТОРЫІ

# Нялёгкая справа

(З ДЗЕННІКАЎ ЖУРНАЛІСТАЎ-ПРАКТЫКАНТАЎ)



«Спачатку сёй-той са студэнтаў-практыкантаў зайздросціў мне: вось, маўляў, тэлефон, тэлевізар, партфель загадчыка, ды яшчэ зручнае мяккае крэсла ў куце... Але хутка гэта прайшло».




«Я тры дні патруліравала ля фабрыкі і не магла адважыцца туды зайсці».

Малюнкі М. РЭДЗЬКІ.

# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ!

Вашаму і нашаму універсітэту споўнілася 50 год. Усе, хто ўнёс сваю лепту ў яго стварэнне і развіццё, ганарыцца сённяшняй працай. Універсітэт святкуе дзень нараджэння, радуецца і сур'ёзна думае аб сваім мінулым, сённяшнім і будучым.

І разам з усімі студэнтамі радуемся і мы, таму што ён і наш універсітэт. Ён адкрыў свае дзверы нам два гады таму назад. Навучыў многаму. І будзе вучыць яшчэ. Калі праз некалькі год мы, маладыя яго выпускнікі, вернемся на радзіму, мы будзем служыць свайму народу.

Дзякуй, універсітэт, за твае клопаты! Дзякуй вам, нашы выкладчыкі!

Мы хочам ад усёй душы павіншаваць вас, студэнты і выкладчыкі БДУ, з вялікім святам!

З днём нараджэння, універсітэт!

СТУДЭНТЫ-БАЛГАРЫ.

# ДЗЯКУЙ ТАБЕ!

Лекцыі, бібліятэкі, грамадскія нагрузкі, экзамены, працоўныя семестры — зноў экзамены, толькі ўжо на сілу духа і мышц... — такім быў мой універсітэт.

Гляджу я кадры дакументальнага фільма «Добры дзень, універсітэт» *, і нібы разгортваецца мінулае. Расказ вядзецца ад трох асоб — студэнта-хіміка Аляксандра Верашчагіна, прафесара Ільі Рыгоравіча Некрашэвіча, аспіранта Алега Слукі. Яны гавораць пра нашу «альма-матэр». А я, як і тысячы іншых гледачоў, у думках дапаўняю іх расказ, таму што ўсё гэта да драбніц знаёма мне і дорага.

Бачу кадры, дзе зазняты в'етнамскія студэнты, успамінаю інтэрнат на вуліцы Бабруйскай — жыў разам з імі, — іх стараннасць, настойлівасць. Бачу кадры, дзе зазняты студэнты на казахстанскай будоўлі, і ўспамінаю саўгас «Усход» Чапаеўскага раёна Уральскай вобласці. Там мы ляпілі з саману кашары, узводзілі жалезабетонныя калоны тэхнічнай майстэрні, будавалі са зборных дзеравяных шчытоў васьмігадовую школу ў ауле. А пасля памяць пераносіць у чэхаславацкую вёску, дзе мы, члены студэнцкага будаўнічага атрада, бетаніравалі ток, цэментавалі сіласныя ямы, наладжвалі футбольныя і валейбольныя паядынкі з сябрамі-чэхамі, спявалі разам з імі, а таксама з італьянцамі, французамі, палякамі і многімі студэнтамі з іншых краін пра тую каліну, якая «цвіце ў полі ля ручая». Гляджу на вясёлы студэнцкі КВЗ, асобныя канцэртныя нумары і ўспамінаю невялікі горад Крайц у ГДР, дзе нашы самадзейныя артысты народнага ансамбля танца «Крыжачок» паказвалі, па словах аўтарытэтных музыказнаўцаў, «высокі клас».

Гляджу на экран і думаю: якое ж вялікае месца займае ў маім жыцці універсітэт, якія сапраўды незабыўныя ўражанні з ім звязаны. А такіх жа, як я, яго выпускнікоў, тысячы!

Многіх з тых, каго паказвае камера, я ведаю асабіста. А з адным з герояў фільма — аспірантам Алегам Слукой, цяпер кандыдатам гістарычных навук, мы за ноч прачыталі ўсе сем трагедый Сафокла, здавалі датэрмінова сесію, каб імчацца ў казахскія стэпы рабіць саман, вазіць з берага Урала гравій і ганарыцца тым, што знаходзімся ў самым цэнтры Еўразіі.

Гэта тое, што я ведаў. А чаго не ведаў! Не ведаў, што ва універсітэце некалі выкладаў ваенную навуку праслаўлены военачальнік, чатырыжды Герой Савецкага Саюза Г. К. Жукаў, што сакратар Цэнтральнага Бюро Кампартыі Беларусі В. Г. Кнорын чытаў курс эканомікі, што рэктар, акадэмік, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі прафесар А. Н. Сеўчанка быў студэнтам фізмата БДУ, што ў памяці прафесара Некрашэвіча, ад імя якога вядзецца апавяданне, — першыя крокі ў навуку Антона Нічыпаравіча, а таксама тое — якую цяпер навукова-тэхнічную базу мае буйнейшая навучальная ўстанова рэспублікі, якія новыя імёны памнажаюць яе славу на сусветнай арэне. І тут я лаўлю сябе на думцы, што мала я знаю пра цябе, мой універсітэт, і як недаравальна доўга збіраюся сказаць вялікае дзякуй сваім выкладчыкам, выказаць ім сваю ўдзячнасць і павагу. Ну хоць бы так, як гэта зрабіў былы выпускнік БДУ Уладзімір Мехаў — аўтар сцэнарыя дакументальнага фільма «Добры дзень, універсітэт!»

В. ПОЛЯК,
журналіст.

* Аўтар сцэнарыя У. Мехаў, рэжысёр-аператар І. Вайняровіч. (Вытворчасць аб'яднання «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм»).



# Літаратурная старонка

ШТОМЕСЯЧНЫ ВЫПУСК

## Тваёй шчодрасцю нам прычасціцца б, тваёй мудрасцю

*Люба ТАРАСЮК*

### ПРЫЗНАННЕ

О, зямля, дарагая зямліца!..
Колькі сэрцу, як птушцы,
ні біцца —
Я ў тваім назаўсёды палоне.
Мне б расціцаю звонкай скаціцца
На твае, як у мамы, далоні...

Ў травы светлыя падаю ніцма.
Ў тым падзенні —
натхненне ўзлёту.
...Скрозь лісцвяную замець
прабіцца б
Маладою, як ранне, лістотай.

Я — зярняці твайго часцінка.
Я табе
сваё сэрца — насцеж.
Мне б у спёку жывой дажджынкай
Да знямоглага долу прыпасці,
Каб магла ты ўдосталь напіцца

Не вадзіцы —
любові сэрца.
Тваёй шчодрасцю мне
прычасціцца б,
Тваёй мудрасцю...

Шчаслівая наканаванасць лёсу — працаваць, вучыцца ў нашым універсітэце ў гэты год, калі ён святкуе свой залаты юбілей — 50-годдзе з дня заснавання. Гэта разумеюць і ўсе ўзлётаўцы — удзельнікі універсітэцкага літаб'яднання, — разумеюць, і кожны з іх адчувае гэта ўсім сэрцам: ці ён ужо загартаваны экзаменам і залікамі пяцікурснік, ці толькі сёлета пераступіў універсітэцкі парог. Бо сапраўды, як не хвалявацца нават пяцікурсніку, калі ў анталагічным зборніку «Універсітэт паэтычны», які выйшаў да юбілею, яго вершы сталі поруч, услед за вершамі такіх слаўных выпускнікоў нашага універсітэта, як Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва, Іван Мележ, Мікола Аўрамчык, Рыгор Барадулін. Вершы сёлетніх першакурснікаў, вядома, не змаглі трапіць у юбілейны зборнік, які рыхтаваўся загадзя. Але верыцца, што іх будучыя творы абавязкова трапяць у чарговую анталогію нашай паэтычнай універсіяды!..

Поруч са знаёмымі ўжо нашаму чытачу маладымі паэтамі Людмілай Забалоцкай, Любай Тарасюк, Міколам Камароўскім, Валерыем Дранчуком і іншымі ў гэтай нізцы выступаюць першакурснікі. І—хочацца яшчэ раз падкрэсліць — гэта сапраўды зайздрасна: стартаваць у такую святочную дату. Святло яе няхай жа азарае ўсіх іх у працы, вучобе і натхненні, у вялікім служэнні ідэалам камунізму!

А. ЛОЙКА,
кіраўнік літаб'яднання «Узлёт»,
доктар філалагічных навук, прафесар.

*Мікола ДЗЕМІДОВІЧ*

* * *

Шукаем чагосьці вялікага,
Ў жыцці не згубіўшы нічога.
Ад бацькавай хаты паклікала
Ў нястрымную далеч дарога.

А недзе, за сіняю лініяй,
Усё ж давядзецца спыніцца.
Родныя рэкі і ліўні
Будуць праз сэрца ліцца.

Аднойчы няведанне страты
Паверне, стаіўшы трывогу,
Да той, дзе выраслі, хаты
Стомленую дарогу.



*Мікола КАМАРОЎСКІ*

### РАЛЛЯ

Ты крок свой прыпыні каля раллі,
Што прылягла да краю небасхілу.
Яна цябе карміла і расціла,
Каб стаў ты цвёрда на сваёй
зямлі.

Хоць жменьку жыта сыпані
рукой —
Тваёй любоўю прарастуць
зярняты...
...Ты праз гады ідзеш да роднай
хаты.
Шуміць калоссе памяці тваёй.

* * *

Палячу да сініх аканіц,
Да гаючых прыпаду крыніц,
Каб на міг пазбавіцца трывог,
Ад шумлівых вуліц і дарог,
Ачуняць ад ветру, ад дажджу—

*Галіна СТОМА*

Засмяяцца над любой
знямогай..
...Аб якім спакоі я кажу? —
Пачынаюся, канчаюся
трывогай.

*Людміла ЗАБАЛОЦКАЯ*

Маладзік серабрыста-зялёны,
Гарката тваіх вуснаў жыве.
Я баюся, што сэрца уронім,
Разаб'ецца яно на траве.
Не жахаюць ні рэкі, ні скалы,
Нават згуба нязбытых надзей.
Больш за ўсё мяне часта пужала
Прыхаваная чэрствасць людзей.
Не згадаеш, ці друг ён, ці вораг,
І за ласкай не ўбачыш таго,
Што твае неўзышоўшыя зоры
Ён кідае крадком у агонь.
Што гараць яны полымем сінім,
Нібы вочы твае і мае.
Мне б знайсці сваёй мудрасці
сілу,
Ды шкада, што яе не стае.
Што яшчэ не магу разгадаць я,
Дзе дабро, дзе за ласкаю зло.
...Неўзышоўшыя зоры аддайце,
Шчырасць сэрцаў, даверлівасць
слоў.

*Валянціна ХАМЧУК*

### ВІДУШЧАСЦЬ

Я зноў лаўлю ў адкрытыя далоні
Шурпатыя ад холаду лісткі.
Вільготны вецер злёгку студзіць
скроні,
Лагодным гладзіць дотыкам рукі.
Ледзь-ледзь працэдзіць сонца праз
аблокі

Скупы і сталы, стрыманы прамень.
Мінуўся час бяздумнай летняй спёкі,
Яснее, халадзее кожны дзень.
І калі нават вочы не расплюшчыць
Або знарок прыкінуцца сляпой,—
Няпрошана з'яўляецца відушчасць
І верны спадарожнік—неспакой.

*Валерый ДРАНЧУК*

### ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Ранак сіні буслiным крылом
Узмахне над смалістаю хатай.
Шчасце выплыве белым пяром:
Сына ўзніме на ганку тата.
Захмялеюць палі травой.
Быццам свет, стане дзень вялікі.
Радасць матчына над зямлёй
Затрапеча крылом буслiхі.

* * *

Што ты ходзіш,
Што ты носіш
Незабудкі з-над рэкі?
Не падам, хоць ты і просіш,
Я табе сваёй рукі.

Не табе мяне усцешыць,
Абдымай, не абдымай,
На вачах маіх усмешкі

*Кацярына КУНКЕВІЧ*

Ты за радасць не прымай.

Без цябе я, нібы камень,
Як без травах сенажаць,
Але ўсё ж сваёму каханню
Я не стану дагаджаць.
За табой хаджу я ўпотай,
Не ўбачыш — не шукай.
Толькі ты маю пяшчоту
За пакорнасць не прымай.



*Марыя ЦІХАНОВІЧ*

### ЖУРАЎЛІ

Пакінулі вы, моўчкі адляцелі
З лісточкам, што кружыўся па-над
домам,—
Пакінулі, і мы асірацелі,
Як гнёзды, што застылі нерухома.
Чакаю зноў, калі вясна зайграе,
Расплюшчыць сотні люстраных вачэй:
Алешына над хатай, хоць старая,
Зазеляне маладзей, званчэй.

## УНІВЕРСІТЭТ ПАЭТЫЧНЫ

Анталогія гэта ўнікальная. Магчыма, такога выдання не мае ні адзін універсітэт краіны. Я маю на ўвазе з любоўю і веданнем справы складзеную прафесарам А. Лойкам кнігу «Універсітэт паэтычны» *.

Вядома, што члены універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт» выдалі ў свой час два паэтычныя зборнікі—«Узлёт» (1965) і «Натхненне» (1967). Таксама не засталіся па-за ўвагай «даўзлётаўскія» літаратурныя альманахі — «Падарунак» (1958) і машынапісная «Вясновая рунь» (1961). Аднак «Універсітэт паэтычны» — якасна новае выданне, якое адрозніваецца ад папярэдніх і сваімі мэтамі, і найбольш высокай культурай творчасці. Гэта і не дзіўна. Кніга выйшла да слаўнага юбілею роднага універсітэта. І складальнік, рэдакцыйная калегія (А. А. Волк, М. Р. Ларчанка, І. Я. Навуменка, Н. С. Гілевіч), а таксама работнікі універсітэцкага выдавецтва пастараліся, каб яна атрымалася сапраўды юбілейнай, святочнай, высакаякаснай.

Ва «Універсітэт паэтычны» ўвайшлі творы ста дваццаці двух аўтараў — ад «маладнякоўца» Паўлюка Труса, «узвышэнца» Кандрата Крапівы і да выпускніцы 1971 года «ўзлётаўкі» Жэні Янішчыц. Пачынаецца анталогія зваротам Якуба Коласа «Сябрам-студэнтам», адрасаваным не толькі студэнтам пяцідзесятых гадоў (Якуб Колас з гэтым зваротам выступіў перад студэнтамі нашага універсітэта ў 1952 годзе), але і нам, сённяшнім гаспадарам роднай альма-матэр. Заканчваецца яна цыклам вершаў тых, хто толькі-што прыйшоў ва універсітэт альбо ў гэтым навучальным годзе збіраецца яго пакінуць. Кожны аўтар прадстаўлены адным, радзей двума вершамі, напісанымі, як правіла, у час вучобы ці працы ў БДУ. Маюцца ў кнізе біябібліяграфічныя даведкі пра літаратараў, а таксама іх партрэты «універсітэцкага перыяду». Глядзіш на гэтыя партрэты і добра ўяўляеш гарэзлівых, вясёлых, прыгожых юнакоў і дзяўчат — сённяшніх акадэмікаў, прафесараў, вядомых дзеячоў літаратуры — на студэнцкай лаўцы, ва універсітэцкіх аўдыторыях, інтэрнатах...

Неаднойчы падкрэслівалася, што БДУ У. І. Леніна ўнёс вялізны ўклад у развіццё не толькі гаспадаркі, навукі краіны, але і беларускай нацыянальнай культуры, літаратуры. З выхадам «Універсітэта паэтычнага» гэты ўклад стаў яшчэ больш відавочным.

Вось ужо пяцьдзесят гадоў у раку беларускай літаратуры ўліваецца чысты струмень творчасці універсітэцкіх літаратараў. Ліцца табе, не перасыхаць, гаючая крыніца!

В. РАГОЙША.

* УНІВЕРСІТЭТ ПАЭТЫЧНЫ. Мінск. Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1971. 224 стар., 6000 экз. Цана 63 кап.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 08796

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Зак. 1266.